З кім згуляюць гандбалісты на чэмпіянаце свету?

СТАР. 4

Ці стане Гродна горадам-помнікам?

СТАР. 6

Свіцязь — любоў і натхненне Міцкевіча

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЛІПЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 135 (27745) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРАДКАЗАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА

Валютны рынак стабільны, экспарт будзе павялічвацца, ураджай сёлета багаты

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча. Гаворка ў ходзе дакладу ішла аб сацыяльна-эканамічным развіцці краіны на сучасным этапе.

У прыватнасці, закраналіся пытанні сітуацыі на ўнутраным валютным рынку краіны. Паводле слоў Прэзідэнта, вельмі важна, што ў апошні час ён стабілізаваўся.

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым канстатаваў, што, вядома, не ва ўсіх, але ў цэлым у насельніцтва на руках быў немалы аб'ём валютных сродкаў. «Не ведаю, да чаго рыхтаваліся, навошта, хоць мы заўсёды казалі, што не збіраемся абвальваць курс нацыянальнай валюты і будзем усяляк падтрымліваць нашу нацыянальную валюту. Вядома, не на шкоду экспарту, але заўсёды будзем весці прадказальную палітыку», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Па выніках сустрэчы Міхаіл Мясніковіч расказаў журналістам, што па стане на сённяшні дзень сальда куплі і продажу насельніцтвам валюты ў 2014 годзе склалася дадатнае ў памеры амаль $ 300 млн. «Гэта значыць, насельніцтва прадало больш, чым купіла ў абменных пунктах. Гэта таксама характарызуе ў пэўнай ступені стабільнасць, таму што няўпэўненасць прыводзіла да таго, што людзі канвертавалі сваю зарплату ў валюту, чакаючы, што будзе нейкая нечаканая хваля дэвальвацыі. У нас няма ніякіх аб'ектыўных прычын для таго, каб такое адбылося», — заявіў прэм'ер-міністр.

Прэм'ер-міністр таксама далажыў Прэзідэнту аб планах урада па павелічэнні аб'ёмаў экспарту прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што, нягледзячы на пэўны рост валавога ўнутранага прадукту, яшчэ ёсць вельмі шмат так званых вузкіх месцаў, і перш за ўсё з экспартам і продажам гатовай прадукцыі. Асобна кіраўнік дзяржавы пацікавіўся выкананнем даручэнняў па рэалізацыі шэрагу праектаў. У прыватнасці, гаворка вялася аб мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці. «Самае галоўнае, каб не атрымалася так, што мы мадэрнізуем прадпрыемствы, вырабім прадукцыю, а потым будуць хадзіць і пад абаротку прасіць у нас сродкі, таму што не могуць прадаць тавар. Гэта недапушчальна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У гутарцы з журналістамі па выніках сустрэчы прэм'ер-міністр распавёў, што наша краіна не мае намеру нарошчваць знешнюю дзяржаўную запазычанасць і будзе імкнуцца да таго, каб максімальна пагашаць тую, што існуе. Паводле яго слоў, на гэтыя мэты ў тым ліку плануецца поўнасцю накіраваць $1,5 млрд ад экспартных пошлін на нафтапрадукты, якія ў 2015 застануцца ў бюджэце Беларусі.

Прэм'ер-міністр у тым ліку далажыў Прэзідэнту аб захадах, якія прымаюцца для павышэння эфектыўнасці ў сельскай гаспадарцы. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў істотна палепшыць становішча спраў, звярнуўшы ўвагу, што ў будаўніцтва малочна-таварных комплексаў укладваюцца вялікія грошы, а належнай аддачы пакуль няма.

На сустрэчы з Прэзідэнтам таксама абмяркоўваўся ход уборачнай кампаніі. Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, ужо па выніках учарашняга дня павінны выйсці на першы мільён тон. «Ураджай добры, і яго трэба сабраць без страт. На гэта асабліва звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Усякае спаборніцтва, якое ў нас прысутнічае пры ўборцы, не павінна адмоўна адбівацца на якасці», — заявіў прэм'ер-міністр, паінфармаваўшы таксама аб рашэнні да 1 жніўня дадаткова паставіць аграрыям яшчэ 300 новых камбайнаў вытворчасці «Гомсельмаш».

АСНОЎНЫЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫМ ПАЎГОДДЗІ

■ Спецыяльны рэпартаж

«ЗАМЕЖНЫЯ» ЯГАДЫ



Фота Надзеі БУЖАН.

Спрошчаны парадак перасячэння мяжы грамадзянамі Украіны сёлета зноў дзейнічае ў трох пунктах пропуску, што знаходзяцца на мяжы з Ровенскай вобласцю нашай паўднёвай краіны-суседкі. Гэта дазваляе грамадзянам Украіны бесперашкодна збіраць дзікаслыя ягады і грыбы на нашай тэрыторыі. Карэспандэнты «Звязды» разам з лесаводамі Палескага лясгаса прынялі ўдзел у прафілактычным рэйдзе ў месцах масавага збору ягад на памежнай тэрыторыі.

СТАР. 3

ЛІЧБА ДНЯ

Br142,8 трлн

склаў рознічны тавараварот у Беларусі ў I паўгоддзі 2014 года — у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ён вырас на 10,9%. За гэты перыяд насельніцтву прададзена харчовых тавараў на Br70,7 трлн, нехарчовых — на Br72,1 трлн, што складае адпаведна 106,7% і 115% да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года. У разліку на душу насельніцтва рознічны тавараварот з пачатку года склаў Br15,1 млн. У I паўгоддзі 2013-га гэты паказчык складаў Br12,7 млн. Як адзначае Нацыянальны статыстычны камітэт, у рознічным таваравароце 81,1% прыпадае на арганізацыі гандлю, 18,9% — на рынкі, гандлёвыя цэнтры.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 22.07.2014 г.

Долар ЗША	10280,00	▲
Еўра	13900,00	▲
Рас. руб.	293,00	▲
Укр. грыўня	883,16	▲

■ Сацыяльны клопат

ПЕРШЫ КРОК З ПАДТРЫМКАЙ

Дзяржава прапануе беспрацоўным бязвыплатныя субсідыі

Сёння зарэгістраваны беспрацоўны мае права атрымаць грошы для арганізацыі ўласнай справы. «Звязда» выслухала гісторыі людзей, якія гэтым правам скарысталіся, а таксама пацікавілася, як правільна атрыманыя сродкі патраціць.



ШАВЕЦ І ФОТАМАЙСТАР

47-гадовая мінчанка Яўгенія Благадатных ужо паўгода як адкрыла сваю майстэрню па рамонце абутку і скураной галантарэі. Да гэтага яна шмат гадоў працавала ў эксперыментальным цэху па пашыву сумак і ўзораў эксклюзіўнага абутку. Потым асвоіла і рамонт скураных вырабаў. Але пасля пераезду прадпрыемства ўмовы працы змяніліся, і Яўгенія звольнілася па стане здароўя. «Дзеці параілі мне звярнуцца ў службу занятасці, расказалі, што можна атрымаць субсідыю на бязвыплатнай аснове, — гаворыць жанчына. — Я спачатку не паверыла: як гэта мне дзяржава проста так возьме і дасць грошы? Але пайшла паглядзець, што і як...».

Спецыялісты прапанавалі Яўгеніі некалькі вакансій, але ўсё ж такі менавіта па яе спецыяльнасці нічога не аказалася. Тады, з улікам таго, што Яўгенія высокакваліфікаваны прафесіянал, які мае вялікі вопыт, ёй параілі адкрыць сваю справу.

СТАР. 5

■ Камунальныя стасункі

РАМОНТ: СПРОШЧАНЫ ВАРЫЯНТ

Але за парушэнне тэхналогіі ўсё адно давядзецца адказваць

Як ужо пісала «Звязда», магчыма, у хуткім часе на правядзенне некаторых рамонтных работ у кватэры (як, напрыклад, замена падлогі ці перанос сантэхнікі) не трэба будзе рабіць праект і ўзгадняць іх з мясцовым выканкамам. «Не паўсюль у рэгіёнах мясцовыя органы ўлады маглі растлумачыць людзям, куды ім ісці і якія дакументы збіраць. Праз гэта ў некаторых сітуацыях працэс зацягваўся. Каб спрасціць працэдуру перапланіроўкі і пераўладкавання і зрабіць яе больш празрыстай, выраШылі выключыць лішнія працэдуры ўзгаднення і падрыхтоўкі праектнай дакументацыі», — патлумачылі нам у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі прычыну такіх змен.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАРАШЭНКА ПАГАДЗІЎСЯ ДАПУСЦІЦЬ РФ ДА РАССЛЕДАВАННЯ КАТАСТРОФЫ BOEING

Расійскіх спецыялістаў дапусцяць да расследавання прычын крушэння малайзійскага Boeing на тэрыторыі Данецкай вобласці Украіны. Прэзідэнт краіны Пётр Парашэнка распарадзіўся прыцягнуць да работ па высвятленні абставін трагедыі эксперта з Расіі. Па звестках «Інтэрфакса», падчас наведвання пасольства Малайзіі ў Кіеве 21 ліпеня Парашэнка заявіў, што «даў даручэнне запрасіць расійскага прадстаўніка для таго, каб усё гэта адбывалася максімальна празрыста». Ён таксама паведаміў, што «з першых жа хвілін» запрасіў да расследавання спецыялістаў тых краін, пасажыры якіх знаходзіліся на борце самалёта. «Я як украінскі прэзідэнт з першых жа хвілін запрасіў прадстаўнікоў краін, якія пацярпелі, у першую чаргу — прадстаўнікоў Нідэрландаў, Малайзіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, ЗША», — заявіў прэзідэнт Украіны, адзначыўшы, што даў даручэнне ваенным спыніць сілавую аперацыю супраць сепаратыстаў у радыусе 40 кіламетраў ад месца авіяцыйнай катастрофы.

АХВЯРАМІ АВІЯЎДАРАЎ У СЕКТАРЫ ГАЗА СТАЛІ 87 ПАЛЕСЦІНЦАЎ

Ахвярамі авіяўдараў у сектары Газа ў нядзелю 20 ліпеня сталі 87 чалавек. Пра гэта паведамляе Al Arabiya са спасылкай на міністэрства аховы здароўя Палесціны. Такім чынам, агульная колькасць загінулых палесцінцаў з пачатку аперацыі перавысіла 400 чалавек. Сярод іх 112 дзяцей, 41 жанчына і 25 пажылых людзей. Раней у нядзелю ўлады Ізраіля заявілі пра намер пашырыць наземную фазу аперацыі «непарушная скала» супраць руху ХАМАС, якая пачалася ўвечары 7 ліпеня. Яе мэта — спыненне ракетных абстрэлаў Ізраіля з боку сектара Газа. За гэты час па ізраільскай тэрыторыі было здзейснена не менш за 1,3 тысячы ракетных удараў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЛАТВІЯ ЗАБАРАНІЛА ЎЪЕЗД КАБЗОНУ, ВАЛЕРЫІ І ГАЗМАНАВУ

Міністэрства замежных спраў Латвіі апублікавала імёны трох вядомых расійскіх спевакоў, якім забаронены ўезд у краіну. Гэта Іосіф Кабзон, Алег Газманаў, а таксама Ала Пярфілава, вядомая пад сцэнічным псеўданімам Валерыя. Як заявіў раней у панядзелак у інтэрв'ю Latvijas Radio міністр замежных спраў Латвіі Эдгар Рынкевіч, у чорны спіс уключаны асобы, якія ў апошні час «агрэсіўна падтрымлівалі» анэксію Крыма і «неаднаразова публічна прыніжальна адзываліся аб дзеяннях Украіны», паведамляе Delfi. Міністр заявіў, што калі асобы, унесеныя ў спіс, ужо знаходзяцца на тэрыторыі Латвіі, іх папросяць пакінуць краіну. Рынкевіч таксама заявіў, што ў сувязі з падзеямі ва Украіне правядзенне фестывалю ў гэтым годзе ў Юрмале, з яго пункту гледжання, было б недарэчным. Падобную пазіцыю займае і міністр культуры Латвіі Даце Мелбардэ. Характэрны каментар з нагоды санкцый пакінуў на сваёй старонцы ў Facebook мэр Рыгі Ніл Ушакоў: «Патрабую, каб міністр замежных спраў Рынкевіч уключыў у «чорны спіс» расійскага імперыяліста Куклачова з яго шавіністычнымі катамі. І тады краіна зможа сапраўды спаць спакойна... У цэлым жа жах нейкі. Зразумела, што ў міністра выбары. Але гэта яшчэ не падстава рабіць з сябе латвійскую версію Кім Чэн Ына лайт».

КАРАТКА

Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых у Беларусі ў гэтым годзе вышэйшая за мінулагоднюю. Самы высокі паказчык у Гродзенскай вобласці — 45,8 ц/га.

Нацыянальны банк Беларусі 21 ліпеня ўвёў у абарачэнне сярэбраную памятную манету «Год Авечкі» серыі «Кітайскі каляндар».

Санітарна-эпідэміялагічная служба Беларусі абмежавала эксплуатацыю 16 зон адпачынку.

Асноўныя работы па рэканструкцыі Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» плануецца завяршыць да пачатку жніўня.

Ужо больш як 430 чалавек выйшлі з месцаў пазбаўлення волі па амністыі з нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прапаўшая раней у Егіпце грамадзянка Беларусі ўжо дастаўлена ў аэрапорт Каіра. Жанчына была затрымана егіпецкімі ўладамі за парушэнне пашпартна-візавага рэжыму і нелегальнае перасячэнне граніцы.

■ На ўзлёце

НЕБА, САМАЛЁТ — ПРЫГАЖОСЦЬ!

Карэспандэнты «Звязды» ўбачылі на свае вочы зямлю з крэсла пілота самалёта, даведаліся пра «лятаючую парту» і зразумелі, што пасведчанне авіятара-аматара можна атрымаць нават толькі дзеля таго, каб зразумець прыгажосць ландшафтаў

СТАР. 3

Фота Надзеі БУЖАН.

За плячыма Юрыя КАМНЕВА 18 тысяч гадзін налёту.

ISSN 1990 - 763X

УЗАЕМНЫ ІНТАРЭС

Наша краіна гатова
паглыбляць супрацоўніцтва з Хабараўскім краем

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Хабараўскага краю Вячаславам Шпортам, паведамляе БЕЛТА.

Прэзідэнт адзначыў, што па цяперашнім часе геаграфічная адлегласць — не перашкода для супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Хабараўскім краем; праўда, сёлета таваразварот знізіўся. «Але ўсё ў нашых руках — часу дастаткова, каб дасягнуць і перасягнуць узровень мінулага года»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Я думаю, мы пастараемся і прымем пэўныя захады ў гэтым напрамку»,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Хабараўскі край штогод імпартуе прадукцыі ў аб'ёме каля $1 млрд, а доля беларускіх паставак складае толькі каля 1%, і гэта вельмі нізкі паказчык. «Думаю, што ў бліжэйшы час мы павінны сур'ёзна заняцца аналізам працэсаў, звязаных з гандлем з Хабараўскім краем, і ўнесці свой дастойны ўклад у развіццё гэтага краю, у пераадоленне наступстваў паводкі мінулага года»,— адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гатовы разгледзець любыя прапановы і пытанні развіцця двухбаковых сувязяў. «Мы ведаем магчымасці адно аднаго, у нас вялікая цікавасць да вас, а ў вас — да нас,— адзначыў кіраўнік дзяржавы.— У нас узаемадапаўняльныя эканомікі, а гэта аснова супрацоўніцтва».

■

АНДРЭЙ ХАРКАВЕЦ ВЫЙШАЎ У АДСТАЎКУ

Андрэй Харкавец вызвалены ад пасады міністра фінансаў у сувязі з выхадам у адстаўку. Адпаведны ўказ падпісаў учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

■ Справы аграрныя

КАРОВУ НЕ ПАДМАНЕШ

У Мінскай вобласці 13 раёнаў пачалі ўборку збожжавых. Пра гэта паведаміў выканаўца абавязкаў старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Юрый ГОРЛАЎ падчас сходу актыву аграпрамысловага комплексу.

Масавае жніво мяркуецца распачаць 20 ліпеня або на наступным тыдні — у залежнасці ад надвор'я. «Убраць збожжавыя і зернебабовыя плануецца за 22 дні. Салому трэба ўпарадкаваць за 25 дзён,— адзначыў Юрый Горлаў.— Для гэтага павінны быць задзейнічаны ўсе рэсурсы вобласці. На гэты конт дасягнуты пэўныя дамоўленасці з Мінскам. Усяго будзе дадаткова прыцягнута больш як 1 тыс. адзінак тэхнікі».

Па словах начальніка аддзела інспекцыі па наглядзе за тэхнічным станам машын і абсталявання Мінаблвыканкама Валерыя Злотніка, у цэнтральным рэгіёне на палі выйдуць 2,5 тыс. збожжаўборачных камбайнаў. Іх гатоўнасць складае 90%. У бліжэйшыя дні будуць ліквідаваны дробныя непаладкі тэхнікі.

Удзельнікі нарады не змаглі абмінуць тэму кармавой базы. На канкрэтных прыкладах былі праілюстраваны факты безгаспадарчасці і абыякавасці: у сянажных траншэях — вада, пасевы кукурузы, пашы, кармавыя ўгоддзі засмечаны пустазеллем. Як адзначыў старшыня аблвыканкама Сямён Шапіра, гэта наступствы безадказнасці, калі сродкі аховы раслін набываюцца цераз пасярэднікаў, а частка іх раскрадаецца. Але ашукаць на мякіне можна чалавека. Карову не падманеш: малако ў яе на языку.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

■ Прыватызацыя

ЖАЛЕЗАБЕТОННЫ ПРЫБЫТАК

Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі распачало прыём заявак ад патэнцыйных стратэгічных інвестараў для Баранавіцкага камбіната жалезабетонных канструкцый.

Да ўдзелу ў працэдуры прыцягнення стратэгічнага інвестара, зацікаўленага ў куплі дзяржаўнага пакета акцый (99,025%) прадпрыемства, запрашаюць нацыянальныя і замежныя кампаніі. Між іншым, ААТ «Баранавіцкі КЖБК» з'яўляецца вытворцам шырокага спектра зборных жалезабетонных вырабаў для прамысловага і жыллёвага будаўніцтва. Таму ўдзельнічаць у выбары інвестара могуць прыватныя кампаніі з вопытам работы ў сферы будаўніцтва або вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, не меншым за тры гады. «Пры гэтым за апошнія тры гады сярэдні аб'ём выручкі або ўласнага капіталу павінен складаць не менш за 90 млн доларaў ЗША або 20 млн доларaў ЗША адпаведна»,— удакладнілі ў аддзеле маркетынгу і камунікацый агенцтва.

Мяркуецца, што пасля разгляду заявак інвестару прапануюць заключыць дагавор на продаж акцый адзіным пакетам з інвестыцыйнымі і сацыяльнымі абавязацельствамі. Стратэгія прыцягнення інвестара на Баранавіцкі КЖБК распрацавана па выніках усебаковага аналізу, праведзенага пры садзейнічанні фінансавага кансультанта. Для ўдзелу ў працэдуры выбару зацікаўленым кампаніям прапануецца да 1 верасня 2014 года накіраваць у агенцтва заяўку па ўстаноўленай форме.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Грошы

АПТЭКІ, ГАСЦІНІЦЫ І ТАКСІ АБСТАЛЮЮЦЬ ПЛАЦЕЖНЫМІ ТЭРМІНАЛАМІ

У сталіцы і абласных цэнтрах іх павінны ўстанавіць налета ў ліпені, а сфера ігральнага бізнесу пяройдзе на «карткі» ўжо на наступным тыдні

Пра гэта гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў і Нацыянальнага банка Беларусі ад 21 мая 2014 года № 489/7, паведамілі карэспандэнту газеты ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах.

Такім чынам, пастановай прадугледжваецца, што сёлета з 22 ліпеня пералік аб'ектаў гандлю і паслуг, якія падлягаюць аснашчэнню плацежнымі тэрміналамі, будзе пашыраны. У яго ўвойдуць усе павільёны і кіёскі, чыгуначныя станцыі (пры абслугоўванні больш як 250 пасажыраў за суткі і наяўнасці лініі сувязі), санаторыі, дамы (базы) адпачынку, аздараўленчыя цэнтры (комплексы), аўтамабільтаксі і дыягнастычныя станцыі, дзе праводзіцца тэхнічны агляд транспартных сродкаў.

У пералічаных аб'ектах усталяванне тэрміналаў будзе ажыццяўляцца паэтапна. Першымі (з 22 ліпеня) павінны абсталёўваць свае аб'екты арганізатары ігральнага бізнесу. Мінск і абласныя цэнтры — з 1 ліпеня 2015 года, гарады раённага падпарадкавання — з 1 студзеня 2016 года, а з 1 ліпеня 2017 года плацежныя тэрміналы павінны стаць даступнымі ўжо па ўсёй тэрыторыі краіны.

Асобна прапісаны тэрмін (з 1 студзеня 2015 года) абавязковага абсталёўвання тэрміналамі буйных аб'ектаў гандлю. Гэта тычыцца тых аб'ектаў, якія працавалі на працягу 2013 года і па-

мер атрыманай выручкі за год па кожным з іх склаў больш за 7,5 тысячы базавых велічынь (БВ), па аб'екце сістэмы спажывецкай кааперацыі — больш за 15 тысяч БВ, аб'екце бытавога абслугоўвання насельніцтва — больш за 3750 БВ.

«У мэтах забеспячэння своечасовага выканання абавязку па ўсталяванні ў аб'ектах плацежных тэрміналаў прадпрыемствам і індывідуальным прадпрымальнікам мэтазгодна загадзя звярнуцца ў банк па пытанні заключэння дагавора на абслугоўванне трымальнікаў банкаўскіх плацежных картак у аб'ектах гандлю (паслуг) і прадастаўленне аплатных тэрміналаў»,— гаворыцца ў інструкцыі МПЗ.

За невыкананне патрабаванняў па ўсталяванні плацежных тэрміналаў суб'ект прадпрымальніцкай дзейнасці можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Так, з-за адсутнасці тэрмінала пры продажы тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у выпадках, вызначаных заканадаўствам, ІП можа заплаціць штраф у памеры да 100 базавых велічынь, а юрыдычная асоба — ад 10 да 200 базавых.

Кіраўнікі падаткавай галіны ўпэўнены, што павелічэнне долі безнаяўных разлікаў у сферы рознічнага гандлю і аказання паслуг насельніцтву будзе садзейнічаць узмацненню кантролю за грашовымі патокамі ўнутры краіны і, як вынік, зніжэнню долі ценявой эканомікі.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Ведай нашых!

МІЖНАРОДНЫЯ АЛІМПІЯДЫ: ПАКУЛЬ БЕЗ ПРОМАХАЎ…

Пяць медалёў заваявалі на 55-й міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы, якая прайшла ў Кейптаўне, беларускія школьнікі.

Усяго ў спаборніцтвах узялі ўдзел 560 школьнікаў са 101 краіны свету. На міжнароднай алімпіядзе юным матэматыкам было прапанавана рашыць 7 задач з наступных раздзелаў: алгебра, камбінаторыка, геаметрыя і тэорыя лічбаў.

Залатым прызёрам алімпіяды стаў Дзмітрый Баброў (выхаванец сталічнай гімназіі № 41). Адзінаццацікласнік Ліцэя БДУ Раман Марчанка заваяў у Кейптаўне ўзнагароду сярэбранай вартасці. А бронзавымі прызёрамі сталі дзесяцікласнік Ліцэя БДУ Валянцін Віцязь, вучань сталічнай гімназіі № 29 Дзмітрый Войнаў і прадстаўнік сталічнай гімназіі № 41 Святаслаў Барадачоў. Яшчэ адзін удзельнік беларускай зборнай Аляксей Гапоненка (таксама гімназія № 41 г. Мінска) быў удастоены пахвальнага водгуку.

Не засталіся без узнагарод беларускія школьнікі і на 25-й міжнароднай алімпіядзе па біялогіі. Сёлета яна праходзіла ў Інданезіі, на экзатычным і вельмі папулярным у турыстаў востраве Балі. Таму ўражанняў ад паездкі ва ўсіх засталося на шмат гадоў наперад. Але акрамя здзяйснення незабыўных экскурсій у сафары-парк і храм, які знаходзіцца над морам, на ўцёсе, школьнікам трэба было яшчэ і адстойваць гонар беларускай школы. Між іншым, за ўзнагароды ў гэтым годзе змагаліся прадстаўнікі 61 краіны свету. «Серабро» ўдалося заваяць выпускніцы Ліцэя БДУ Таццяне Скугарэўскай. «Бронзу» сёлета беларусы таксама заваявалі. Ёю можа пахваліцца выхаванка сярэдняй школы № 15 Магілёва Кацярына Драгунава. А ў ліцэісткі БДУ Маргарыты Курбан — пахвальны водгук.

Кіраўнікамі беларускай зборнай выступілі дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл Дзмітрый Сандакоў і выкладчык Ліцэя БДУ Васіль Панкратаў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Бліжэй да людзей

МЯНЯЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ АДРАС…

У дзеда, як той казаў, адна бяседа: дзе быў, з кім піў і хто яго біў… Іншая справа — у ягоных унукаў. «Я праз інтэрнэт сабе туфлі заказаў»,— хваліцца адзін. «А я сваёй жонцы — новы гадзіннік. Выгадна!»

Так, у модзе цяпер дыстанцыйны гандаль, шмат пераваг у ім… Але і недахопаў таксама: атрыманне пасылак было сярод іх не найбольшым, але ж…

Надоечы рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» адкрыла першы ў сталіцы пункт па выдачы міжнародных паштовых адпраўленняў. Размешчаны ён у адным з густанаселеных спальных раёнаў — на вуліцы Адзінцова, дом 36–1 — і абсталяваны ўсімі неабходнымі сродкамі. У прыватнасці, адмыслова распрацаванае праграмнае забеспячэнне для ўліку і фіксацыі на стэлажах месца знаходжання пасылак і дробных пакетаў да мінімуму скарачае час на іх пошукі і выдачу кліентам.

— Папярэдне мы не раз сустракаліся з імі, вывучалі меркаванні і, адкрываючы першы пункт па выдачы міжнародных паштовых адпраўленняў, улічылі, здаецца, усе пажаданні,— гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па камерцыйных пытаннях спадарыня Таццяна ГВОЗДЗЕВА.**— У прыватнасці, атрымаць свае пасылкі і дробныя пакеты з-за межаў краіны нашы кліенты (пакуль — толькі тыя, што жывуць у зоне абслугоўвання 55-га, 17-га і 136-га аддзяленняў сувязі) змогуць без чаргі, у камфортным памяшканні, у будныя дні з 8.00 да 22.00, у суботу і нядзелю — з 9.00 да 20.00…

Да канца года, як плануецца, у Мінску адкрыюцца яшчэ тры такія пункты. Наступны — ужо ў самы бліжэйшы час у мікрараёне Уручча.

А гэта значыць, што цяпер жыхарам сталіцы (а надалей — і абласных цэнтраў), якія праз інтэрнэт заказваюць тавары з-за межаў краіны, трэба ўважліва чытаць атрыманыя з пошты паведамленні. Там, апроч іншага, абавязкова пазначаюцца адрасы выдачы пасылак.

Валянціна ДОЎНАР

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НОВЫ ПАРУШАЛЬНІК

Міністэрства эканомікі вынесла чарговае прадпісанне аб зніжэнні цэн на паўфабрыкаты з мяса птушкі. На гэты раз — агракамбінату «Дзяржынскі».

У прэс-службе ведамства паведамляюць, што па выніках разгляду сітуацыі з рэзкім павелічэннем адпускных цэн на паўфабрыкаты з мяса птушкі ў маі 2014 года Мінэканомікі ў мэтах спынення парушэння антыманапольнага заканадаўства вынесла ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» прадпісанне аб зніжэнні цэн (аднаўленні ўзроўню цэн, што дзейнічалі да 21 мая 2014 года, з улікам магчымага абгрунтаванага іх павышэння). «Прадпрыемства не прыняло захадаў па зніжэнні цэн у адпаведнасці з лістом-папярэджаннем антыманапольнага органа ад 16 чэрвеня 2014 года аб ліквідацыі парушэння антыманапольнага заканадаўства»,— удакладняюць у міністэрстве.

Нагадаем, што нядаўна аналагічныя прадпісанні былі вынесены ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка», СТАА «Вітконпрадукт», ААТ «Смалявічы Бройлер» і СЗАТ «Сервалюкс» (філіял «Сервалюкс Агра»).

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПЕРШЫ АДКАЗЧЫК — УЛАСНІК, А НЕ ПРАДАВЕЦ

З 22 ліпеня ўласнікі гандлёвых цэнтраў і рынкаў павіны прымаць меры па захаванні прадаўцамі, якія вядуць сваю дзейнасць на іх тэрыторыі, заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Міністэрства гандлю звяртае ўвагу на тое, што з гэтага дня ўступае ў сілу Закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь».

У гэтай сувязі гандлёвая інспекцыя міністэрства ўзмоцніць кантроль за дзейнасцю рынкаў і гандлёвых цэнтраў. Пры гэтым, як адзначаюць спецыялісты Мінгандлю, будзе давацца прыцыпіповая ацэнка працы работнікаў гандлю.

Напрыклад, толькі ў першым паўгоддзі гандлёвай інспекцыяй міністэрства падчас кантрольных мерапрыемстваў (гандлёвыя цэнтры «Імпульс», «Сілуэт», «Пасаж», «Люстэрка» і інш.) парушэнні заканадаўства былі ўстаноўлены больш чым у 350 суб'ектаў гаспадарання. Але калі раней да адказнасці прыцягваліся толькі непасрэдна парушальнікі, дык пасля 22 ліпеня меры ўздзеяння будуць выкарыстоўвацца ў першую чаргу да ўласнікаў рынкаў і гандлёвых цэнтраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АДЗЕННЯ З КІТАЯ НЕ ДАЧАКАЛІСЯ

У сталіцы затрымалі 24-гадовую мінчанку, якая займалася махлярствам праз інтэрнэт.

— Дзяўчына, вырашыўшы падзарабіць на даверлівасці грамадзян, напачатку аформілася індывідуальным прадпрымальнікам і зарэгістравалася ў адной з сацыяльных сетак, прапанаваўшы паслугі па заказе адзення з Кітая. Па першым часе яна сапраўды выконвала свае абавязацельствы, аднак праз некалькі месяцаў заказы выконваць перастала, кожны раз прыдумваючы ўсё новыя адгаворкі,— паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш.— Даверлівыя кліенты пералічвалі грошы па пошце на яе банкаўскую картку, але ніхто асабіста з прадаўцом не сустракаўся. Пакупніцы ведалі толькі яе прозвішча і імя.

Папярэдне мяркуецца, што сума шкоды, нанесеная махляркай, перавышае 100 мільёнаў рублёў. Як распавяла сама затрыманая, пачынаючы з лютага, яна вырашыла прымаць заказы ад пакупнікоў, а прыбыткам разлічвацца за даўгі. Цяпер гэтая інфармацыя правяраецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАДВЯЛА САМАЎПЭЎНЕНАСЦЬ

Хто мог падумаць, што прадметам цікавасці аўтамабільных зладзеяў стануць «жыгулі» шостай мадэлі. Але менавіта на іх выпаў выбар двух маладых бабруйчан, якім чамусьці не спалася каля 4 гадзін раніцы.

Напэўна, яны нават і не падазравалі, што за імі ў гэты ранні час назіраў з акна сваёй кватэры гаспадар «шасцёркі». Асабіста затрымаць зладзеяў ён не паспеў, затое патэлефанаваў у міліцыю. На яго сігнал быў накіраваны нарад міліцыі, які дзяжурыў непадалёку. У яго складзе быў кінолаг з сабакам.

— Калі супрацоўнікі міліцыі агледзелі двор, дзе адбылося злачынства, і выйшлі ў суседні, яны нават вачам не паверылі — стаіць тая самая «шасцёрка»,— падзяліўся падрабязнасцямі **старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы маёр міліцыі Яўген ПАЎЛЮК.**— Згоншчыкі спачатку і не збіраліся ўцякаць, і толькі калі ўбачылі, што да іх ідуць, кінуліся бегчы. Іх прыпыніла каманда: «Стой, спускаю сабаку». Не паспелі яны апамятацца, як на іх руках апынуліся наручнікі. Няўдалых рабаўнікоў падвяла залішняя самаўпэўненасць. Яны вырашылі паназіраць, як іх шукаюць міліцыянеры, і… папаліся.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

РЭГІЁНЫ ПАЛЯПШАЮЦЬ ПАКАЗЧЫКІ

Па выніках працы рэгіёнаў у сферах гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва за пяць месяцаў года, падведзеных Міністэрствам гандлю, лепшай прызнаная Гродзенская вобласць. Другое месца заняла сталіца, трэцяе — Мінская вобласць.

Як патлумачылі спецыялісты міністэрства, рэйтынгавая ацэнка працы выкарыстоўваецца з кастрычніка мінулага года. Гэтая методыка, заснавана на палажэннях інструкцыі аб парадку правядзення і разліку рэйтынгавай ацэнкі, зацверджанай пастановай Мінэканомікі ад 15 чэрвеня 2012 года №55, дазваляе дастаткова аб'ектыўна ацэньваць працу рэгіёнаў па асноўных паказчыках, што характарызуюць іх работу ва ўказаных сферах. Пры гэтым улічваюцца даныя па выручцы ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг на аднаго сярэдняспісачнага работніка, рознічнаму і аптоваму тавараабароту, аб'ёму бытавых паслуг, росту вытворчасці працы, прамым замежным інвестыцыям, рэнтабельнасці продажу, долі тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным тавараабароце гандлю і іншае.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Приорбанк RZB Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 июля 2014 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 1 июля 2014	на 1 июля 2013
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 007 429	906 041
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		2 809	6 049
4	Средства в Национальном банке	1103		1 022 652	1 109 509
5	Средства в банках	1104		1 458 907	540 350
6	Ценные бумаги	1105		905 106	506 166
7	Кредиты клиентам	1106		11 848 055	10 154 266
8	Производные финансовые активы	1107		1 211 253	1 230 099
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		27 874	27 874
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		1 205 768	998 834
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		1 827	872
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		217 380	156 895
14	**ИТОГО активы**	**11**		**18 909 060**	**15 636 955**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		491	643
17	Средства банков	1202		3 359 233	2 335 223
18	Средства клиентов	1203		11 963 794	10 466 946
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		220 588	301 424
20	Производные финансовые обязательства	1205		5 443	181
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		316 551	185 992
23	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**15 866 100**	**13 290 409**
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		412 279	412 279
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		948 898	654 306
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		650 610	576 132
29	Накопленная прибыль	1215		1 031 173	703 829
30	Всего собственный капитал	121		3 042 960	2 346 546
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**18 909 060**	**15 636 955**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 июля 2014 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 1 июля 2014	на 1 июля 2013
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 063 998	762 551
2	Процентные расходы	2012		476 654	417 792
3	Чистые процентные доходы	201		587 344	344 759
4	Комиссионные доходы	2021		586 958	513 968
5	Комиссионные расходы	2022		88 716	76 911
6	Чистые комиссионные доходы	202		498 242	437 057
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		512	399
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		-	2
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		83 058	35 053
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		101 447	50 842
11	Чистые отчисления в резервы	207		286 353	160 888
12	Прочие доходы	208		35 166	38 138
13	Операционные расходы	209		496 250	352 796
14	Прочие расходы	210		47 691	76 972
15	Прибыль до налогообложения	211		475 475	315 594
16	Расход по налогу на прибыль	212		77 767	80 850
17	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**397 708**	**234 744**

Временно и.о. Председателя Правления **И.В.Лихогруд**

Заместитель главного бухгалтера **С.И.Капцевич**

http://www.priorbank.by/r/news/accounting/quarter/quarter_2014_year/quarter_07_14/

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

■ Погляд

НА ШАЛЯХ СУСВЕТНАГА БАЛАНСУ

Што можа стаць якарам стабілізацыі эканомікі і шчытом міру на планеце

Як вядома, 15–16 ліпеня ў гарадах Фарталеза і Бразіліа прайшоў VI саміт БРІКС. Па яго выніках была прынята Фарталезская дэкларацыя, а таксама падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве паміж экспартна-крэдытнымі агенцтвамі краін БРІКС; пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне інавацый; дагавор аб стварэнні пула ўмоўных валютных рэсерваў краін БРІКС; пагадненне аб стварэнні новага банка развіцця БРІКС. Лідары краін — удзельніц БРІКС — Расіі, Кітая, Індыі, Бразіліі і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі — адзначылі высокі ўзровень арганізацыі і паспяховасць мерапрыемства. Асноўную ўвагу прэсы прыцягнула пазіцыя прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, што і зразумела, улічваючы цяперашнія праблемы краіны з Захадам з-за падзей ва Украіне. Уладзімір Пуцін адзначыў, што БРІКС — гэта самы вялікі рынак у свеце, яго сукупны валавы прадукт дасягнуў 21 працэнта ад агульнасусветнага аб'ёму. Банк развіцця і валютны пул, якія ствараюцца, з сумарнымі рэсурсамі ў 200 мільярдаў доларaў закладваюць асновы для каардынацыі макраэканамічнай палітыкі паміж краінамі-ўдзельніцамі. Прэзідэнт Расіі таксама заявіў, што БРІКС мае ўжо больш за два дзясяткі фарматаў супрацоўніцтва — ад штогадовых самітаў да рабочых груп — па міжнароднай інфармацыйнай бяспецы, ахове здароўя, сельскай гаспадарцы, навуцы і тэхніцы і многіх іншых напрамках. Важна і тое, што на Расію, Бразілію, Індыю, Кітай і Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку ўжо прыпадае 11 працэнтаў назапашаных капіталаўкладанняў і амаль 20 працэнтаў сусветнага гандлю. Уладзімір Пуцін, адзначыўшы, што краіны БРІКС валодаюць унікальнай мінеральна-сыравіннай базай (ад 30 да 60 працэнтаў сусветных запасаў па розных відах рэсурсаў), заклікаў у якасці новага кірунку разгарнуць узаемадзеянне ў горназдабычы і перапрацоўцы, арганізаваць цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў для металургічных галін краін БРІКС.

На другім месцы па ступені цікавасці знаходзіўся старшыня КНР Сі Цзіньпін як прадстаўнік самай магутнай эканомікі БРІКС. На яго думку, краіны БРІКС павінны стаць якарам стабілізацыі сусветнай эканомікі і шчытом міру на планеце, увязаць уласнае развіццё з працэсамі міру і стабільнасці ва ўсім свеце, стаць абаронцамі міру і глабальнай бяспекі, а таксама будаўнікамі бяспечнага міжнароднага парадку. А таксама разглядаць сумесную барацьбу з тэрарызмам і забеспячэнне кібербяспекі ў якасці важных сфер супрацоўніцтва, выступіць за новую канцэпцыю бяспекі і разам абараніць цяперашнюю міжнародную сістэму бяспекі і супрацоўніцтва, вядучую ролю ў якой выконвае ААН.

Сур'ёзная цікавасць была ў сусветных палітыкаў і да ролі Індыі на праведзеным саміце ў сувязі з тым, што яе прадстаўляў новы прэм'ер-міністр — нядаўна абраны Нарэндра Модзі. Ён заявіў, што краіны БРІКС павінны выступіць разам у мэтах абароны міру на ўсёй планеце і ўдасканалення глабальнага кіравання, садзейнічаць рэформам квот у Міжнародным валютным фондзе, распрацоўцы парадку развіцця пасля 2015 года і скарачэння беднасці.

Што тычыцца гаспадыні саміту, прэзідэнта Бразіліі Дылмы Роўсеф, то яна адзначыла, што краіны БРІКС павінны глядзець у будучыню, працаваць над самаўмацаваннем і рабіць акцэнт на згуртаванасці; усталяваць цесныя і трывалыя партнёрскія адносіны, удасканаліць глабальнае кіраванне, спрыяць мультыпалярызацыі свету і дэмакратызацыі міжнародных адносін.

Прэзідэнта ПАР калегі павіншавалі з паспяховай перамогай на чарговых прэзідэнцкіх выбарах і з высокімі вынікамі яго партыі (Афрыканскі нацыянальны кангрэс) на мясцовых і парламенцкіх выбарах. Ён адзначыў, што краіны БРІКС маюць намер абмяняцца з краінамі, якія развіваюцца, вопытам у галіне развіцця, сумесна выступаць за мультылатэралізм, аказваць падтрымку Афрыцы ў дасягненні міру, бяспекі і развіцця, садзейнічаць палітычнаму ўрэгуляванню гарачых рэгіянальных праблем.

Вядома, цэнтральнымі тэмамі для абмеркавання ў сусветных СМІ і ў палітычных колах сталі новыя структуры — пул умоўных валютных рэсерваў краін БРІКС і Новы банк развіцця БРІКС. Практычна адразу пайшоў каментар з боку прадстаўніка Дзярждэпартамента ЗША Джэн Псакі, якая заявіла, што Злучаным Штатам пакуль рана турбавацца з-за магчымых наступстваў стварэння банка БРІКС у сувязі з тым, што амерыканцам пакуль не зразумелы задачы, мэты і спосабы кіравання банкам. Але падстава для хвалявання, вядома ж, ёсць. Як было адзначана і на саміце, Захад занадта доўга пярэчыць ужо, здавалася б, даўно ўзгодненай рэформе квот МВФ, у выніку якой значэнне ў арганізацыі краін БРІКС павінна сур'ёзна павысіцца. У такой сітуацыі новы банк БРІКС можа выступіць альтэрнатывай як МВФ, так і Сусветнага банка, а альтэрнатывы такога роду могуць падарваць уплыў Захаду на глабальнай сусветнай арэне, што мацней за ўсё можа ўдарыць па ЗША.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Ёсць ідэя

БУЙНІЦКІ ЗААСАД — НА YOUTUBE

На тэрыторыі самага прывабнага турыстычнага аб'екта Магілёўшчыны плануюць пабудаваць музей рыб, канатную дарогу і ўнікальную аграсядзібу

Сёння Буйніцкі заасад — адзін з папулярных комплексаў не толькі Магілёўшчыны, але і Беларусі. Жывёлы знаходзяцца тут у набліжаных да прыродных умовах. Аб тым, што яны адчуваюць сябе як дома, сведчыць вялікая нараджальнасць. За апошнія 10 гадоў тут з'явіліся на свет 128 новых насельнікаў. Частка з іх папоўніла заасады Беларусі і Расіі.

Турыстаў прываблівае не толькі разнастайны жывёльны мір, але і шмат забаўляльных аб'ектаў. Тая ж чыгунка, па якой можна здзейсніць займальнае падарожжа па лесе і паназіраць, як паводзяць сябе жывёлы ў прыродзе. Аматары конных прагулак могуць праехацца на старадаўняй карэце. Палюбавацца маляўнічай прыродай можна і з боку Дняпра, скарыстаўшыся адным з наяўных тут катараў. Для аматараў экзотыкі ёсць сцежка здароўя з элементамі экстрыму.

Тое, што цікавасць да Буйніцкага заасада павялічваецца, сведчыць рост даходаў ад турыстычнай дзейнасці. За кошт аказання паслуг і пазабюджэтнай дзейнасці за апошнія 4 гады зароблена каля 12 мільярдаў рублёў (на 2 мільярды больш, чым было ўкладзена ў развіццё). Па словах **ініцыятара і непасрэднага куратара заасада, дырэктара Магілёўскага агралесатэхнічнага каледжа імя К.П. Арлоўскага Георгія МАЛІНОЎСКАГА,** вядзецца супрацоўніцтва з 43 турыстычнымі арганізацыямі. Цяпер гаворка ідзе аб тым, каб пабудаваць на тэрыторыі заасада вялікі музей рыб і канатную дарогу. Але без спонсарскіх сродкаў ажыццявіць амбіцыйныя планы будзе цяжка. Адна толькі канатная дарога, па падліках праекціроўшчыкаў, абыдзецца прыкладна ў 5 мільярдаў рублёў. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік таксама зацікаўлены ў тым, каб і музей, і дарога з'явіліся. Ён параіў кіраўніцтву каледжа больш актыўна развіваць сферу паслуг і запрашаць усіх ахвотных на платнае навучанне.

Сёння назіраецца вялікая цікавасць да аграэкатурызму, але спецыялістаў, якія могуць прасоўваць гэтыя паслугі, у Беларусі няма. І Георгій Маліноўскі звярнуўся з прапановай, каб кіраўніцтва краіны разгледзела магчымасць увядзення новай спецыяльнасці ў тарыфна-кваліфікацыйны даведнік работ і прафесій рабочых. На яго думку, каледж змог бы стаць падыходзячым месцам для падрыхтоўкі гэтых кадраў. Ёсць праект, па якім да 2015 года плануецца пабудаваць на тэрыторыі заасада аграсядзібу — яна стане добрай пляцоўкай для заняткаў будучых спецыялістаў па аграэкатурызме.

У няўрымслівага Георгія Маліноўскага ёсць яшчэ адна цікавая задумка. Ён марыць аб усталяванні на тэрыторыі заасада відэакамер, з дапамогай якіх можна было б назіраць за паводзінамі буйніцкіх жывёл на YouTube. Цяпер вядуцца пошукі спонсараў для ажыццяўлення гэтай ідэі.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Вось так!

Кіно ў Бабруйску

У горадзе на Бярэзіне можна падзарабіць на здымках тэлесерыяла

Над працягам знакамітага савецкага тэлесерыяла, які ствараўся ў 80-я гады мінулага стагоддзя, працуе па дзяржзаказе нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм». Рэжысёр-пастаноўшчык карціны «Дзяржаўная мяжа. Легенды АСАМ» — Ігар Чацверыкоў, а галоўную ролю ў ёй выконвае расійскі акцёр Андрэй Фралоў.

Падзеі адбываюцца на розных пагранзаставах Беларусі, куды лёс закідвае героя. У Бабруйску група плануе працаваць амаль да канца лета, у кадр трапяць розныя куткі горада, у тым ліку і наваколле санаторыя імя Леніна, дзе калісьці здымаліся сцэны для фільма «Я родам з дзяцінства» з удзелам Уладзіміра Высоцкага.

Па словах **дырэктара кінастужкі Ірыны ФІЛІПАВАЙ,** карціна будзе знятая цалкам за кошт дзяржаўнага бюджэту, без падтрымкі якіх-небудзь спонсараў.

Сума ганарараў трымаецца ў сакрэце, але калі я ў якасці звычайнай бабруйчанкі патэлефанавала па адным з нумароў, змешчаных на мясцовым сайце, прыемны жаночы голас паведаміў: за ўдзел у масоўцы заплацяць прыблізна 87 тысяч рублёў, за групавыя здымкі — 113 тысяч.

Нэлі ЗІГУЛЯ

РАМОНТ: СПРОШЧАНЫ ВАРЫЯНТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праўда, нават калі дазвол на замену, напрыклад, падлогавага пакрыцця цяпер браць не спатрэбіцца, то існуючыя нарматывы і тэхналогіі правядзення работ ніхто не адмяняў.

— Калі ў заканадаўстве некаторыя тэхналагічныя нарматывы не прапісаны, гэта не значыць, што імі не трэба кіравацца, бо ёсць яшчэ і тэхнічныя нарматыўна-прававыя акты, — падкрэсліў **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Андрэй РАМАШКА.** — Так, у адпаведнасці з праектам у кватэры мусіць быць добрая гукаізаляцыя. Але калі пры ўкладцы падлогавага пакрыцця яна пагаршаецца і суседзям гэта замінае, то ўсё адно давядзецца перарабіць усё адпаведна з тэхналогіяй.

Зрэшты, калі суседзі не скардзяцца на пастаяннае тупанне над галавой, то да пары да часу можна спаць спакойна. Але трэба мець на ўвазе, што парушэнне нормаў — гэта не жартачкі. Бо, напрыклад, у дапаможніку да будаўнічых нормаў і правілаў падлозе адводзіцца асаблівае месца. Падлога — гэта, ні многа ні мала, будаўнічая канструкцыя, на якой ажыццяўляецца ўвесь вытворчы працэс і жыццядзейнасць людзей і ад стану якой залежыць якасць прадукцыі альбо здароўе людзей. Дык ці не прасцей адразу парупіцца пра падложку пад ламінат, каб пасля не было лішніх турбот і фінансавых выдаткаў на яго перакладанне?

Нагадаем: згодна з праектам новай рэдакцыі пастановы Савета Міністраў, больш не трэба будзе браць дазвол для замены і пераносу сістэм гарачага і халоднага водазабеспячэння, электразабеспячэння, водаадвядзення і каналізацыі, электра- і сантэхнічнага абсталявання, замены і пераносу змеевіка, змены канструкцыі падлогі, зашклення балконаў і лоджый. Мяркуюць таксама спрасціць працэдуру ўсталявання індывідуальных антэн і іншых канструкцый на фасадах і дахах дамоў. Праект новай пастановы ўжо гатовы, яго плануецца прыняць пасля карэкціроўкі заканадаўства па адміністрацыйных працэдурах, якая цяпер адбываецца. Мінулая ж пастанова Саўміна аб парадку перабудовы і перапланіроўкі ў кватэры была прынята летась у маі.

— Мы ўносім змены не для таго, каб нешта забараніць ці абмежаваць у нечым грамадзян. Гэта робіцца для таго, каб зрабіць максімальна камфортным жыццё людзей і іх суседзяў, — зазначылі ў Мінжылкамгасе.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ДАРЭЧЫ

НАСЕЛЬНІЦТВА БУДЗЕ КАМПЕНСАВАЦЬ ЗАТРАТЫ ПА БЯГУЧЫМ РАМОНЦЕ ЖЫЛФОНДУ ТОЛЬКІ ЗА РАБОТЫ ЎНУТРЫ ПАД'ЕЗДА

Вызначаны пералікі відаў работ па бягучым рамонце жылфонду, якія будуць аплачвацца сродкамі з мясцовых бюджэтаў, а таксама сродкамі, якія ўносяцца ўласнікамі, наймальнікамі жылля і членамі арганізацый забудоўшчыкаў у якасці платы за бягучы рамонт. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якая афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БЕЛТА.

За кошт сродкаў уласнікаў і наймальнікаў жылля будуць выконвацца работы па рамонце пад'ездаў шматкватэрных жылых дамоў (аднаўленне тынкоўкі і абліцоўкі сцен, столі, рамонт падлогі, рамонт і замена асобных элементаў смеццеправодаў, малярныя работы), а таксама рамонт печаў і дымаходаў.

У пералік відаў работ па бягучым рамонце, крыніцамі фінансавання якіх з'яўляюцца сродкі мясцовых бюджэтаў, увайшлі работы па рамонце фундаментаў, сцен, перакрыццяў, дахаў, аконных і дзвярных запаўненняў месцаў агульнага карыстання, перагародак, лесвіц, балконаў, ганкаў, казыркоў над уваходамі ў пад'езды і балконамі верхніх паверхаў. Таксама ў гэты пералік увайшлі работы па ўнутранай аддзелцы тэхнічных памяшканняў, вонкавай аддзелцы будынкаў. За кошт сродкаў з мясцовага бюджэту таксама будуць вырашацца пытанні, звязаныя з работай сістэм ацяплення, вентыляцыі, гарачага і халоднага водазабеспячэння, водаадвядзення (каналізацыя) і электратэхнічных устройстваў.

Як растлумачыў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Андрэй Рамашка, да ўступлення ў сілу Жыллёвага кодэкса работы па бягучым рамонце выконваліся ў рамках тэхнічнага абслугоўвання жылфонду. «Пасля ўступлення ў сілу гэтага дакумента бягучы рамонт стаў асобнай асноўнай жыллёва-камунальнай паслугай, фактычныя затраты на аказанне якой павінны аплачвацца насельніцтвам. Усе работы па бягучым рамонце павінны былі легчы на плечы грамадзян, у тым ліку такія віды работ, як рамонт даху, фасадаў, стыкаў і іншыя, даволі аб'ёмныя і дарагія», — адзначыў спецыяліст.

Аднак указам Прэзідэнта Беларусі № 550 ад 5 снежня 2013 года было вызначана некалькі крыніц фінансавання бягучага рамонту — сродкі мясцовых бюджэтаў і сродкі ад ўнясення ўласнікамі, наймальнікамі жылых памяшканняў і членамі арганізацый забудоўшчыкаў платы за бягучы рамонт, а таксама іншыя крыніцы фінансавання, не забароненыя заканадаўствам. Адпаведна, з'явілася неабходнасць вызначыць, якія менавіта віды работ фінансуюцца той ці іншай крыніцай. Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

«ЗАМЕЖНЫЯ» ЯГАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Палескі лясгас размяшчаецца на тэрыторыі адразу дзвюх абласцей: Гомельскай і Брэсцкай. Большая яго частка знаходзіцца на Століншчыне — у самым сэрцы беларускага Палесся. Нас у першую чаргу зацікавіла Храпунскае лясніцтва, што знаходзіцца на самай мяжы з Украінай. Менавіта там збіраюць грыбы і ягады жыхары, што перасякаюць мяжу ў спрошчаным рэжыме.

Пераход украінцаў праз «кардон» адбываецца адразу ў трох пунктах пропуску: «Дроздынь», «Познань» і «Бярозавае». Спрошчаны пропуск суседзяў праз мяжу некалькі гадоў таму дазволіў наш Прэзідэнт. Справа ў тым, што беларускі лес для ўкраінскіх памежных вёсак бліжэйшы за астатнія. Некаторым трэба ўсяго толькі выйсці за агароджу ўласнага ўчастка, каб апынуцца на тэрыторыі Беларусі. Летась, дзеля таго, каб пазбіраць чарніцы, журавіны і грыбы ў нашым лесе, суседзі перасеклі мяжу больш за 83 тысячы разоў.

Спрошчаны пераход дзейнічае, што называецца, «у сезон»: сёлета яго межы былі абазначаны як 1 ліпеня і 10 жніўня. У гэты час адбываецца збор чарніц. Увосень вылучаецца асобны перыяд на збор журавін. На памежныя пункты пропуску перадаюцца спісы жыхароў дзесяці блізкіх да мяжы вёсак. Маючы на руках адпаведныя дакументы, вяскоўцы могуць пераходзіць мяжу без адчувальных цяжкасцяў. Праўда, адзіны дазволены для пераходу транспарт — веласіпед.

...Знакаміты савецкі ўсюдыход «ГАЗ-66» з ровам узрывае зямлю, перабіраецца цераз грязь і лужыны. На звычайным аўтамабілі трапіць у памежны лес наўрад ці атрымаецца. Дажджу тут не было некалькі дзён, але балота застаецца балотам нават без штодзённага падсілкоўвання. Лесаводы карыстаюцца або згаданымі вышэй машынамі з высокай праходнасцю, або лёгкімі матацыкламі. Менавіта з-за балота беларусы да памежнага лесу рэдка дахадзяць. Ды і апошняя беларуская вёска — Дзяржынск — знаходзіцца ад яго значна далей, чым украінскія.

— Гэты край мае непаўторную гісторыю, — расказвае **дырэктар Палескага лясгаса Аляксей МАРЫНІЧ,** — той жа Дзяржынск стаў называцца менавіта так толькі ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя. Да гэтага вёска насіла назву Радзівілавічы, думаю, здагадацца аб яе паходжанні няцяжка. У ваколіцах шмат гістарычных помнікаў і аб'ектаў спадчыны. Некаторыя апынуліся на тэрыторыі Украіны пасля вызначэння мяжы, напрыклад, славуты 1300-гадовы дуб.

Такая ж гісторыя адбылася і з многімі жыхарамі. Некаторыя палешукі, якія за савецкім часам былі запісаныя беларусамі, у 90-я атрымалі ўкраінскія пашпарты, і наадварот. Прывычныя для гэтага краю шлюбы паміж жыхарамі суседніх вёсак неўзабаве пачалі лічыцца «міжнароднымі». Мяжа раздзяліла не толькі суседзяў, але і родзічаў: зараз некаторым дзецям даводзіцца праходзіць усе працэдуры перасячэння мяжы, каб трапіць да бацькоў, жывучы ад іх у дзясятку кіламетраў.

Лес у глухім балоце больш падобны да тайгі: паўсюль замест травы расце шэры мох, сосны тут прысадзістыя і няроўныя. Лесаводы жартам называюць іх «мачтавымі». Меліярацыя тут ніколі не праводзілася, таму зямля для сельскай гаспадаркі малапрыдатная. А вось для збіральнікаў грыбоў і ягад гэта сапраўдны рай. Людзі тут заўсёды жылі менавіта з лесу.

У сярэдзіне ліпеня збіральнікаў ужо мала: чарніцы амаль адышлі. Калі яшчэ нядаўна праз мяжу штодзень праходзілі сотні ягаднікаў, то ў дзень рэйду іх было ўсяго дваццаць тры. Мы сустракаем на апошніх метрах беларускай зямлі жанчыну, што менавіта сёння вырашыла выбрацца ў ягады.

Таццяне Міхайлаўне КРАЎЧЭНІ — 63, яна жыве ва ўкраінскай вёсцы Дроздынь і прыйшла ў беларускі лес па чарніцы.

— Амаль уся наша вёска ходзіць па грыбы і ягады ў Беларусь. Бо побач з намі такога шчодрага лесу няма. Уся наша здабыча тут. Збіраю ягады для сябе, бо сёлета іх зусім мала. Летась было болей, таму і сушыла, і прадавала. Для многіх аднавяскоўцаў збор ягад і грыбоў — галоўны занятак летам. Бізнесмены ездзяць па вёсках і набываюць сабранае, таму вялікія сем'і могуць на гэтым зарабіць нядрэнныя грошы. Мая пенсія ўсяго 1113 грыўняў (прыкладна мільён беларускіх рублёў па цяперашнім курсе. — **Аўт.**), лес сапраўды дапамагае пракарміцца. Добра, што цяпер можна без цяжкасцяў хадзіць праз мяжу, бо гэта мае мясціны, якія я ведаю з глыбокага дзяцінства. Хто я: беларуска ці ўкраінка? Цяжка сказаць: маці была запісаная беларускай, я — ужо ўкраінкай. Мы — народы-браты, і гэта галоўнае.

Пакуль мы размаўляем з Таццянай Міхайлаўнай, лесаводы разглядаюць яе «здабычу». У першую чаргу іх цікавіць, што і якім чынам збірае чалавек. Карыстацца прыстасаваннямі накшталт так званых «грабянцоў» строга забаронена. За парушэнне правілаў зборшчыкаў пазбаўляюць права на спрошчаны пераход мяжы, а забароненыя прыстасаванні адбіраюць.

На зваротным шляху сустракаем яшчэ аднаго «замежнага» госця. 67-гадовы **Васіль Фёдаравіч МАРЫНІЧ** вяртаецца дахаты (таксама ў Дроздынь) з цэлым кошыкам лісічак.

— Гэта на суп, — каментуе Васіль Фёдаравіч, — будзе што з'есці вечарам з жонкай. Грыбоў зараз малавата. Прадаваць не буду, самому б хапіла. Добра, што цяпер пускаюць праз мяжу. Сочаць за парадкам пільна. Бутэльку ад вады, бачыце, нясу з сабой, не выкідаю, бо за смецце ў лесе штрафуюць.

Вяртаемся з падарожжа ў кантору лясніцтва. Лесаводы дэманструюць «грабянцы», адабраныя ў парушальнікаў. З цягам часу выпадкаў з парушэннямі пры зборы дзікаросłых ягад становіцца ўсё менш: украінцы вельмі цэняць сваё права пераходу праз мяжу. Раней такі пераход звычайна сумяшчаўся для іх з парушэннем закону. Хапае, праўда, і іншых праблем. Лесаводы скардзяцца на нявыхаванасць наведнікаў лесу незалежна ад іх грамадзянства. Нават у самым глухім кутку Палесся можна знайсці смецце, пакінутае там збіральнікамі ці проста адпачывальнікамі.

Магчыма, каб зразумець каштоўнасць лесу, трэба пабачыць людзей, для якіх ён не месца адпачынку — карміцель.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Мінск — Столінскі раён — Мінск.

НЕБА, САМАЛЁТ — ПРЫГАЖОСЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пра такіх, як ён, кажуць: «Неба не адпускае». Грамадзянскай авіяцыі пілот-інструктар Юрый Камнеў прысвяціў больш за 30 гадоў свайго жыцця, а таму і на пенсіі ўсё роўна працягвае лятаць — на лёгкіх самалётах. Сам Юрый прызнаецца, што для яго неба, як для кагосьці рыбалка: зацягвае надоўга і беспаваротна. А пачалося захапленне самалётамі для яго ў дзяцінстве.

— Я амаль вырас на аэрадроме, — усміхаецца Юрый. — Мой бацька быў штурманам, брат таксама лятаў. У школе займаўся ў авіямадэльным гуртку, а ўжо пасля вырашыў стаць лётчыкам. Скончыў Кіраваградскае лётна-штурманскае вучылішча грамадзянскай авіяцыі і ў свой першы прафесійны авіярэйс «Мінск-Мурманск» я адправіўся ў 1986 годзе. Працаваў у «Аэрафлоце» і «Белавія».

За яго плячыма 18 тысяч гадзін налёту, а гэта прыкладна 8 тысяч рэйсаў! Сярод пасажыраў былі высокапастаўленыя чыноўнікі, артысты і спартсмены. Ён не можа ўявіць сваё жыццё без авіяцыі. А таму прыкладна раз на тыдзень прыязджае на аэрадром у Хожава, што пад Маладзечнам. Часам прымае практычныя іспыты ў пілотаў у асацыяцыі аматараў авіяцыі, але найчасцей уздымаецца ў блакіт таму, што проста не можа ўявіць сваё жыццё без усіх гэтых навігацыйных прыбораў, штурвалаў і непаўторных краявідаў з вышыні палёту. Што казаць, калі нават сыны — Анатоль і Раман — пайшлі па слядах бацькі і ўжо працуюць пілотамі ў «Белавія».

На адной прасторнай пляцоўцы аэрадрома чакаюць наступных вылетаў некалькі «АНаў» («Беллесавія») з паветранымі вінтамі, на другой — адпачывае дзясятак планераў і лёгкіх самалётаў. Гэтым разам Камнеў завітаў сюды з расійскім таварышам Андрэем Лаўронавым, які раз на год прыязджае пад Маладзечна. Андрэй хоць і не з'яўляецца прафесійным пілотам, аднак любоў да авіяцыі перамагла: ён скончыў адмысловыя курсы і цяпер таксама самастойна можа кіраваць планерамі. І пакуль Камнеў рыхтуе да вылету свайго крылатага сябра, уводзіць нас у курс справы.

— Гэта амерыканскі самалёт «Сэсна-172», які называюць «лятаючай партай» для амерыканскіх і еўрапейскіх лётных школ, — паказвае на самалёт, за якім шчыруе Юрый, Лаўронаў. — Ён лічыцца самым масавым у авіяцыі. З сярэдзіны 1950-х пабудавана звыш 43000 самалётаў у больш чым 25 мадыфікацыях. Ён — асноўны самалёт для навучання і вельмі лёгкі ў кіраванні.

— Цікава, а колькі будзе каштаваць маленькі самалёт ці планер? — накіроўваю пытанне ўжо Камневу.

— Усё ў межах коштаў на аўтамабілі. Цэны на планеры даволі даступныя. Нават пэўныя парашуты каштуюць даражэй за планер.

— І як асацыяцыя ў такім разе набывае тэхніку?

— Па-рознаму. Часам і ў складчыну, але за лётную падрыхтоўку грошы не бяром. Мы некамерцыйная арганізацыя. Людзі робяць свой унёсак тым, што ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы апаратаў, у іх набыцці.

Планерамі можна кіраваць з 15-гадовага ўзросту. Сваю тэорыю будучыя пілоты-аматары вывучаюць у Дэпартаменце па авіяцыі, праходзяць адпаведную медыцынскую камісію і толькі пасля гэтага можна распачынаць практычныя трэніроўкі.

— А якое самае складанае практыкаванне для навучэнцаў?

— Адмова рухавіка і пасадка на непадрыхтаваную пляцоўку. Праўда, нічога страшнага ў гэтым няма, бо ніхто не збіраецца ствараць знарок экстрэмальныя ўмовы. Як той казаў, бяспека вышэй за ўсё.

Аднак усёй вучобе папярэднічае так званы «траял флайт», пробны палёт, падчас якога кандыдат у пілоты мусіць усвядоміць, а ці патрэбна яму гэта наогул. Падобны і выпаў на долю карэспандэнтаў «Звязды». Добрая праверка вестыбулярнага апарату, між іншым. З набіраннем вышыні адчуваю, як закладвае вушы, і заўважаю, як па баках усё ператвараецца ў дробнае, нават нязначнае. Здаецца, што перад табой пляцоўка з канструктарам «Лега», на якім чорныя кропкі — каровы, блакітныя ніткі — ручаі, а выверэныя геаметрычныя лініі — межы вясковых дваroў. Над Маладзечнам можна ўдалечыні пабачыць хмарачосы Мінска і вялізную блакітную пляму Вілейскага вадасховішча. І калі праз хвілін дзесяць мы мякка садзімся на аэрадромны грунт, найперш дзялюся сваімі думкамі пра геаметрыю вёсак і палёў.

— Так, адтуль выдатна відаць, як добра ўладкаваны свет, — заўважае Юрый Камнеў. — Зверху па ландшафце можна лёгка пазнаць любую краіну.

— І як вам Беларусь зверху?

— Зялёная, як Шатландыя.

І калі мы ўжо пакідаем аэрадром, бачым, як Камнеў чарговы раз за гэты дзень набірае вышыню і, напэўна, тысячны раз бачыць усю гэту прыгажосць. Робіцца нават крыху зайздрасна. І ў такую хвіліну хочацца пайсці вучыцца на пілота-аматара толькі дзеля гэтых беларускіх краявідаў.

Тарас ШЧЫРЫ.

Маладзечанскі раён.

Фотаздымкі Надзеі БУКАН.

■ Спорт-тайм

ЛІДАРЫ ЎПЭЎНЕНА НАБІРАЮЦЬ БАЛЫ

Вынікі футбольнага чэмпіянату, рэкорды нацыянальнага першынства па плаванні і сапернікі зборнай Беларусі па гандболе — «Звязда» прапануе падборку самых цікавых навін спорту Беларусі за апошнія дні.

1. БАТЭ і мінскае «Дынама» атрымалі чарговыя перамогі ў першынстве краіны па футболе. Барысаўчане ў гасцях былі мацнейшымі за «Слуцк» (3:1), а сталічныя дынамаўцы перайгралі брэсцкіх аднаклубнікаў (3:1). Гульня азнаменавалася не толькі залевай, але і непрыемным гульнявым момантам. Балгарскі абаронца брэсцкай дружыны Любэн Нікалаў зламаў нагу мінчаніну Арцёму Быкаву. «У мяне няма слоў,— заўважыў пасля сустрэчы Нікалаў.— Я вельмі шкадую. Атрымалася так, што я крыху спазніўся ў той сітуацыі. Я не гуляў у ногі — хацеў пацэліць у мяч. Але Быкаў хутчэй паставіў нагу…». На гэты конт выказаўся і галоўны трэнер сталічных Уладзімір Журавель: «Траўма Быкава выбіла мяне з каляіны. Я знерваваўся. Прычына гэтай траўмы — гульцы сапернікa дзейнічалі на мяжы фола, не паспявалі за намі. Ніякай размовы пра канструктыўную гульню ісці не можа. Мяне вельмі закрануў адзін момант. Я з вялікай павагай стаўлюся да Рамана Васілюка (футбаліст брэсцкага «Дынама», экс-нападаючы зборнай Беларусі.— **Аўт.**), аднак калі ён падбухторвае сваіх партнёраў: «вынесі таго», «забі таго», ніякага стаўлення да гэтай каманды няма». Астатнія сустрэчы 18-га тура прынеслі наступныя вынік: «Тарпеда-БелАЗ» — «Шахцёр» (0:1), «Нафтан» — «Белшына» (3:1), «Дняпро» — «Гомель» (1:1), «Мінск» — «Нёман» (1:1). Па-ранейшаму ў турнірнай табліцы лідзіруюць мінскае «Дынама» (44 балы) і БАТЭ (41 бал). На апошнім радку з 10 баламі знаходзіцца бабруйская «Белшына».

2. Мужчынская зборная Беларусі па гандболе даведалася, хто будзе сапернікамі на чэмпіянаце свету, які прыме ў наступным годзе Катар. У групе А нашы суайчыннікі сустрэнуцца з Катарам, Іспаніяй, Славеніяй, Бразіліяй і Чылі. Турнір адбудзецца ў Досе з 15 студзеня па 1 лютага.

3. Як паведаміў Сяргей Вярсоцкі, прэс-сакратар Беларускай федэрацыі плавання, **на чэмпіянаце Беларусі на кароткай вадзе ў Брэсце ўсталявана 5 нацыянальных рэкордаў.**

4. У Маскве адбылося лёсаванне баскетбольнай лігі ВТБ сезона 2014/15. Каманда «Цмокі-Мінск» трапіла ў групу «В» разам з клубамі УНІКС, «Хімкі», «Чырвоныя Крылы», «Аўтадор» (усе — Расія), «Летувас Рытас», «Леткабеліс», «Невежыс» (усе — Літва), «Астана» (Казахстан), ВЭФ (Латвія), «Байзонс» (Фінляндыя).

5. Нападаючы хакейнага клуба «Гомель» Яўген Саламонаў падпісаў з екацярынбургскім «Аўтамабілістам» праглядальны кантракт. У мінулым сезоне за беларускую каманду Яўген правёў 62 гульні і набраў 64 балы (39+25).

Тарас ШЧЫРЫ

■

ПА ЛЕСКАХ — ДА ПЕРАМОГІ

Дзевяцікласніца гомельскай школы № 21 Алена Прышчэпава толькі што вярнулася ў родны Гомель пераможцай

Юная гамяльчанка хутчэй усіх паднялася па штурмавых лесках. Дзяўчына ў складзе беларускай каманды прыняла ўдзел у III чэмпіянаце свету сярод моладзі, V чэмпіянаце свету сярод юнакоў і першынстве свету сярод дзяўчат па пажарна-выратавальным спорце.

У спаборніцтвах, якія праходзілі ў чэшскім горадзе Світавы, прынялі ўдзел каманды з 12 краін: Беларусі, Балгарыі, Паўднёвай Карэі, Казахстана, Украіны, Польшчы, Славакіі, Расіі, Чэхіі, Літвы, Латвіі і Харватыі. Сярод стандартных практыкаванняў — уздым па штурмавых лесках, 100-метровая паласа перашкод, пажарная эстафета, баявое разгортванне.

Між іншым, міжнародныя спаборніцтвы па пажарна-выратавальным спорце менавіта сярод дзяўчат праходзілі ўпершыню. І адразу — удала для беларусаў. Чэмпіёнка Алена Прышчэпава гаворыць, што больш за ўсё ёй дапамагла падтрымка трэнера і каманды:

— Спачатку нават не паверыла, што перамагла. Тым больш што адрыў ад бліжэйшай саперніцы, польскай спартсменкі, быў мінімальны — 0,2 секунды. Вельмі моцныя каманды былі з Чэхіі, Польшчы і Расіі. Дарэчы, трэцяе месца па тым жа відзе заняла віцяблянка Паліна Аршаўская.

Інэса КАРПІНА, дырэктар гомельскай школы № 21, дзе вучыцца пятнаццацігадовая спартсменка, гаворыць, што дзяўчынка вельмі мэтанакіраваная. Пажарна-выратавальным спортам пачала займацца нядаўна, але ж з уласцівым ёй азартам і захопленасцю.

Алена гаворыць, што дакладна пакуль не вырашыла, куды пойдзе вучыцца пасля заканчэння школы. Але ж разглядае і магчымасць звязаць свой далейшы лёс са службай выратавальнікаў:

— Магчыма, буду паступаць у Гомельскі інжынерны інстытут МНС Рэспублікі Беларусь. Хацелася б стаць выратавальніцай. Вельмі падабаецца займацца пажарна-выратавальным спортам, і таму думаю, што ў мяне яшчэ шмат чаго атрымаецца ў гэтым кірунку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже капитального строения, находящегося в собственности ОАО «Могилевский домостроительный комбинат»
27 августа 2014 года

№ лота	Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь)	Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (без учета НДС)	Размер задатка, бел. руб.	Характеристика объекта	Условия аукциона
1	Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-48189, общей площадью 1 806,9 кв.м, расположенное в г. Могилеве, по ул. Заслонова, 22	5 179 200 000	258 960 000	2-этажное здание столовой с подвалом 1977 г. постройки. Фундамент – сборный железобетонный; стены - кирпичные, крупнопанельные; перекрытия – железобетонное; перегородки – кирпичные, крупнопанельные; крыша – мягкорулонная совмещенная; полы – плиточные, бетонные, мозаичные; проемы оконные – двойные, витражи, дверные – ДСП, филенчатые. Имеется центральное отопление, водопровод, канализация, горячее водоснабжение, электроосвещение, лифты грузовые, радио, телефон.	Без условий

Начальная цена снижен на 20 процентов.
Аукцион состоится 27 августа 2014 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.
Заявки принимаются ежедневно с 23 июля 2014 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявлений и внесения задатка – «25» августа 2014 года до 17.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона **27 августа 2014 года** с 14.00 до 15.00 часов.

Продавец: ОАО «Могилевский домостроительный комбинат», 212003, г. Могилев, пер. Гаражный, 2а, тел.: (0222) 22-44-57, 25-34-98, 22-31-95.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны: 22-21-78, 22-00-89.

Площадь земельного участка – 0,4228 для содержания и обслуживания столовой.

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;

- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность:

- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона, обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – возможность предоставления рассрочки на 2 месяца.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 000 000 (Сто миллионов) белорусских рублей: победителем аукциона в случаях не подписания протокола о результатах аукциона, не возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, не заключения договора купли-продажи предмета аукциона; единственным участником аукциона - в случае отказа или уклонения от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, заключения договора купли-продажи предмета аукциона; участниками аукциона, отказавшимися предложить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.

ПОПЛАВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Березинского района Минской области (далее Продавец) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже 1 (одного) земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Красный Берег:

№	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1.	Березинский район, д. Красный Берег, ул. Центральная, 75 620484305601000187	0,2396	электро-снабжение	20000000	2000000

Задаток перечисляется на р/с 3604060201881 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисова, код 810, УНН 600036561, ОКПО 04431843.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **22 августа 2014 года в 10.00** по адресу: Березинский район, аг. Поплавы, Поплавский сельский Совет (зал заседаний).

Заявления на участие и необходимые документы (паспорт и платежный документ, подтверждающий внесение задатка) принимаются ежедневно (кроме воскресенья) до 17.00 (в субботу до 13.00) по адресу: аг. Поплавы Березинского района Минской области, Поплавский сельский Совет (кабинет № 3).

Последний день приема заявлений 19 августа 2014 года.
Контактный телефон: (8-017-15) 48-245.

ОАО «Слуцкий льнозавод»
извещает акционеров о проведении внеочередного собрания акционеров ОАО «Слуцкий льнозавод»

Дата и время проведения: 05 августа 2014 года в 10.00.

Место проведения: г. Слуцк Минской области, ул. Ленина, 300, актовый зал.

Повестка дня:
1. О проведении внеочередного собрания акционеров.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45.
Для регистрации акционеров необходимо иметь:
- юридическим лицам: руководителям – служебное удостоверение (иной подтверждающий документ и паспорт);
- иному представителю – доверенность на представление юридического лица на собрании акционеров и паспорт;
- физическим лицам: паспорт; представителям – доверенность, удостоверенную в установленном порядке и паспорт.

Информация по вопросам повестки собрания предоставляется акционерам ОАО «Слуцкий льнозавод» по месту нахождения ОАО: г. Слуцк, ул. Ленина, 300 с 8.00 до 17.00.

Телефоны для справок: (8-01795) 61526; 61655.

УНН 690657228 *Наблюдательный совет ОАО «Слуцкий льнозавод».*

Открытое акционерное общество

«Реммех»

Учетный номер плательщика: **100016829**
Вид экономической деятельности:
Производство строительных металлоконструкций
Орган управления: **Минстройархитектуры**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220024, г. Минск, п/у Колядичи, ул. Бабушкина, 48**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2013 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	29358	25507
амортизация	102	14342	12272
остаточная стоимость	110	15016	13235
из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования	110а	40	41
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	7	7
амортизация	112	7	7
остаточная стоимость	120	–	–
Доходные вложения в материальные активы			
первоначальная стоимость	121	–	–
амортизация	122	–	–
остаточная стоимость	130	–	–
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	–	–
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	–	–
прочие доходные вложения в материальные активы	133	–	–
Вложения в долгосрочные активы	140	–	–
Долгосрочные финансовые вложения	150	2	2
Отложенные налоговые активы	160	–	–
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	–	–
Прочие долгосрочные активы	180	–	–
Итого по разделу I	**190**	**15018**	**13237**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	6696	3791
в том числе: материалы	211	3851	2337
животные на выращивании и откорме	212	–	–
незавершенное производство	213	1950	–
готовая продукция и товары	214	892	1454
товары отгруженные	215	–	–
прочие запасы	216	3	–
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	–	–
Расходы будущих периодов	230	–	–
в том числе: курсовые разницы	231	–	–
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	854	29
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	1509	3151
по налогам и сборам в бюджет	251	–	–
из нее инновационного фонда Минстройархитектуры	251а	–	–
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	252	–	–
Краткосрочные финансовые вложения	260	–	–
Денежные средства и их эквиваленты	270	189	171
в т.ч. денежные средства на депозитных счетах	271	–	–
Прочие краткосрочные активы	280	41	41
в том числе: недостачи и потери	281	41	41
Итого по разделу II	**290**	**9289**	**7183**
Баланс	300	24307	**20420**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	8756	938
Неоплаченная часть уставного капитала	420	–	–
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	–	–
Резервный капитал	440	61	61
Добавочный капитал	450	7995	12408
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	468	468
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	–	–
Целевое финансирование	480	–	–
Итого по разделу III	**490**	**17280**	**13875**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	–	–
в т.ч. инновационного фонда Минстройахитектуры	511	–	–
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	512	–	–
Прочие долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	–	–
Отложенные налоговые обязательства	530	–	–
Доходы будущих периодов	540	–	–
в том числе: курсовые разницы	541	–	–
Резервы предстоящих платежей	550	–	–
Прочие долгосрочные обязательства	560	–	–
Итого по разделу IV	**590**	**–**	**–**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	3789	4246
в т.ч. инвестиционного фонда Минстройархитектуры	611	–	–
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	–	–
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	3238	2299
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	2184	716
по авансам полученным	632	–	–
по налогам и сборам	633	244	1223
из нее инновационному фонду Минстройархитектуры	633а	–	583
по социальному страхованию и обеспечению	634	145	191
по оплате труда	635	442	169
по лизинговым платежам	636	–	–
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	10	–
в том числе:			
в бюджет	637а	–	–
авансовые поступления в счёт вкладов в уставный капитал	637б	–	–
прочим кредиторам	638	213	–
в т.ч. инвестиционному фонду Минстройархитектуры	638а	–	–
Обязательства, предназначенные для реализации	640	–	–
Доходы будущих периодов	650	–	–
в том числе: курсовые разницы	651	–	–
Резервы предстоящих платежей	660	–	–
Прочие краткосрочные обязательства	670	–	–
Итого по разделу V	**690**	**7027**	**6545**
Баланс	**700**	**24307**	**20420**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2013 года	За январь – декабрь 2012 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	20304	29765
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	14324	23955
Валовая прибыль (010 - 020)	030	5980	5810
Управленческие расходы	040	(3566)	(5146)
Расходы на реализацию	050	(–)	(–)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	2414	664
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1383	245
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(2529)	(110)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	1268	799
Доходы по инвестиционной деятельности	100	–	11
в том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	–	–
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	–	–
проценты к получению	103	–	11
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	–	–
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(–)	(–)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	–	–
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	–	–
Доходы по финансовой деятельности	120	–	–
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	–	–
прочие доходы по финансовой деятельности	122	–	–
Расходы по финансовой деятельности	130	(1267)	(250)
в том числе:			
проценты к уплате	131	1267	250
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	–	–
прочие расходы по финансовой деятельности	133	–	–
Иные доходы и расходы	140	–	–
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	(1267)	(239)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	1	560
Налог на прибыль	170	(1)	(92)
Изменение отложенных налоговых активов	180	–	–
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	–	–
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(–)	(–)
Прибыль (убыток), перераспределяемые в пределах юридического лица	205	–	–
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200 + 205)	210	–	468
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	2142	1908
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	–	–
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	2142	2376
Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей	250	–	75
Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей	260	–	20

Руководитель **В.В. Янушкевич**

Главный бухгалтер **В.П. Герман**

БТА БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2014	01.07.2013
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	37 967	43 987
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	187 619	188 510
5	Средства в банках	1104	19 049	18 876
6	Ценные бумаги	1105	33 472	28 844
7	Кредиты клиентам	1106	691 685	540 856
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	47 362	40 635
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Отложенные налоговые активы	1111	-	-
13	Прочие активы	1112	4 734	7 803
14	ИТОГО активы	11	1 021 888	869 511
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	33 462	49 837
17	Средства банков	1202	155 989	119 367
18	Средства клиентов	1203	659 423	505 007
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	22 383	61 815
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	3 518	3 949
23	ВСЕГО обязательства	120	874 775	739 975
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	61 334	61 334
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	4 504	3 983
28	Фонд переоценки статей баланса	1214	44 402	29 944
29	Накопленная прибыль	1215	36 873	34 275
30	ВСЕГО капитал	121	147 113	129 536
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	1 021 888	869 511

И.о. Председателя Правления **Алимбаев Е.Б.**

И.о. Главного бухгалтера **Ковалева Т.Н.**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2014	01.07.2013
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	75 671	55 222
2	Процентные расходы	2012	43 413	31 546
3	Чистые процентные доходы	201	32 258	23 676
4	Комиссионные доходы	2021	13 812	10 810
5	Комиссионные расходы	2022	1 338	1 178
6	Чистые комиссионные доходы	202	12 474	9 632
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	4 107	1 810
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	141	(12)
11	Чистые отчисления в резервы	207	8 892	623
12	Прочие доходы	208	4 377	5 641
13	Операционные расходы	209	34 404	30 358
14	Прочие расходы	210	1 851	1 823
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	8 210	7 943
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1 365	1 256
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	6 845	6 687

И.о. Председателя Правления **Алимбаев Е.Б.**

И.о. Главного бухгалтера **Ковалева Т.Н.**

ЗАО «БТА Банк» Лицензия НБ РБ № 17 от 28.05.2013 г. УНП 807000071

ПЕРШЫ КРОК З ПАДТРЫМКАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Спачатку трэба было скласці бізнес-план, — распавядае жанчына. — Мне дапамагла ў гэтым дачка, маркетолаг па адукацыі. Мы разам з ёй распісалі, чым збіраемся займацца. У службе занятасці мне падрабязна растлумачылі, як зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка: якія для гэтага патрэбны дакументы і куды іх адвезці. Усё аказалася не так складана і даволі хутка. Адзіная цяжкасць — я даволі доўга не магла знайсці памяшканне для майстэрні. Пад офісы, склады арандаваць памяшканне нашмат лягчэй. Але ўрэшце Мінгарвыканкам даў дазвол на арэнду памяшкання ў былой лазні. Мы там зрабілі невялікі рамонт, і ўжо ў лютым адкрыліся.

— Я не шкадую, што занялася гэтым. Вядома, ёсць канкурэнцыя, але я буду рабіць усё, каб людзі ішлі менавіта да нас: «браць» якасцю, меншым коштам. Мне цікава, ды і запалу пакуль хапае... — Яўгенія Благадатных настроена аптымістычна.

❍ ❍ ❍

25-гадовы Станіслаў Міхальчук пасля заканчэння БНТУ працаваў інжынерам на прадпрыемстве. Але яшчэ ў 11 класе ён захапіўся фатаграфіяй, і калі тэрмін адпрацоўкі пасля ўніверсітэта закончыўся, зразумеўшы, што памыліўся з выбарам прафесіі, вырашыў заняцца тым, што было даўно даспадобы.

— Я цвёрда намерваўся звязаць сваё жыццё з фатаграфіяй, а тут мама

сказала, што ёсць магчымасць атрымаць субсідыю, — успамінае хлопец. — Я падумаў, што лішні аб'ектыў мне не пашкодзіць, і звярнуўся ў службу занятасці Фрунзенскага раёна Мінска. Там мне ўсё падрабязна растлумачылі, можна сказаць, «расклалі па паліцах», што і як, што павінна быць у бізнес-плане і інш. У верасні мінулага года я абараніў свой бізнес-план, атрымаў субсідыю і зарэгістраваўся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Усё аказалася вельмі лёгка, усё было празрыста. Калі ўзнікала якоенебудзь пытанне, заўсёды можна было задаць яго спецыялістам са службы занятасці...

Зараз Станіслаў займаецца любімай справай. «Мне падабаецца рабіць розныя праекты, — гаворыць ён. — Большасць фатографаў зарабляе ў асноўным на вясельных фотасесіях, але я ад гэтага зараз адыходжу, бо там мала творчасці. Я раблю партфоліо, працую з рознымі прадпрыемствамі: раблю здымкі для іх рэкламных буклетаў, сайтаў. Пару месяцаў таму пачаў рабіць фотатуры. Гэта здымкі, якія атрымліваюцца падобнымі на камп'ютарную гульню: для гэтага поўнасцю скануецца, напрыклад, пакой, далей усе здымкі «сшываюцца» ў адзін, і далей гэты пакой, кіруючы курсорам на экране манітора, можна паглядзець па камп'ютары з розных ракурсаў...», — мяркуючы па ўсім, Станіслаў вельмі захоплены сваёй новай справай.

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА — ДЛЯ ЭНЕРГІЧНЫХ, МАБІЛЬНЫХ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ЛЮДЗЕЙ

— Гэта адна з самых прывабных нашых праграм, — расказвае пра выдаткоўванне субсідый беспрацоўным **начальнік аддзела аналізу і рэгулявання рынку працы ўпраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Святлана ЛЯВОНЧЫК.** — Але мы даем субсідыі не ўсім. Згодна з заканадаўствам, мы павінны забяспечыць працаўладкаванне на тыя вакансіі, якія маюцца ў горадзе. У Мінску сёння каля 18 тысяч свабодных вакансій, і наша задача — запоўніць іх. Але ёсць і такія праграмы, як садзейнічанне прадпрымальніцкай дзейнасці, развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы. На гэта накіравана не толькі выдзяленне субсідый, а і адпаведныя навучальныя курсы. На іх не вучаць рамантаваць абутак альбо шыць сукенкі, а знаёмяць з прававым полем развіцця прадпрымальніцтва і асновамі арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Такія курсы карыстаюцца попытам.

Разам з тым Святлана Лявончык папярэджвае, што прадпрымальніцтва — гэта сфера дзейнасці для энергічных, мабільных, ініцыятыўных людзей. «Шчыра кажучы, такія людзі рэдка трапляюць у лік беспрацоўных, — гаворыць яна. — За апошнія паўгода мы пракансультавалі больш за 200 чалавек. І некаторым беспрацоўным рэкамендавалі звярнуць увагу на вакансіі, якія маюцца ў горадзе. Але, тым не менш, за першыя шэсць месяцаў гэтага года мы далі накіраванне на курсы «Прадпрымальніцкая дзейнасць» 52 чалавекам, яшчэ 70 мінчан атрымалі субсідыі.

Памер субсідыі, калі будучы прадпрымальнік пражывае ў сельскай мясцовасці і ў малых гарадах з устойліва высокім узроўнем беспрацоўя, складае 15 бюджэтаў пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, у Мінску і іншых гарадах — 11 БПМ. Нагадаем, што сёння БПМ роўны 1 212 470 рублёў.

Цікава, што калі раней большасць будучых індывідуальных прадпрымальнікаў звярталіся ў службу занятасці па субсідыю на арганізацыю гандлёвай дзейнасці, то цяпер такіх толькі каля 20%. Як адзначаюць ва ўпраўленні па літыкі занятасці Мінпрацы і сацабароны, сёння з боку беспрацоўных, якія жадаюць адкрыць сваю справу, назіраецца рост цікавасці да сферы паслуг. Так, у апошні час людзі ў асноўным хочуць атрымаць фінансавую падтрымку для аказання насельніцтву будаўнічых, транспартных і іншых паслуг, адкрыцця цырульняў і г.д. Павялічваецца і колькасць субсідый на стварэнне вытворчасцяў, у тым ліку на вёсцы.

Усяго дзяржаўная служба занятасці Беларусі ў студзені—ліпені гэтага года аказала садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай, рамеснай дзейнасці, а таксама дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму 1100 беспрацоўным. 729 чалавек атрымалі накіраванне на прафнавучанне. Нагадаем, што Дзяржаўнай праграмай садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2014 год прадугледжана выдзяленне фінансавай падтрымкі 2155 беспрацоўным.

❍ ❍ ❍

Таксама трэба адзначыць, што заканадаўства ў нас дастаткова гнуткае, але апошнім часам становіцца больш патрабавальным. Гэта звязана з тэндэнцыяй павышэння эфектыўнасці дзяржпадтрымкі. Так, сёлета стала больш сур'ёзнай адказнасць атрымальніка субсідыі за неажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці.

Калі чалавек не ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць больш за 6 месяцаў на працягу 12-месячнага перыяду з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка або рэгістрацыі прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, ён абавязаны вярнуць суму субсідыі ў 7-дзённы тэрмін з дня надыходу абавязацельстваў па яе вяртанні. Выключэнне складаюць толькі выпадкі прыпынення прадпрымальніцкай дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама неажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці ў перыяд выканання прысуду, звязанага з абмежаваннем права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, у перыяд часовай непрацаздольнасці і іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам (прызыў на тэрміновую ваенную службу, ваенныя і спецыяльныя зборы і інш.).

Святлана БУСЬКО.

ДАВЕДКА «Звязды»

Як беспрацоўнаму атрымаць субсідыю

1. Стаць на ўлік па беспрацоўі ў службе занятасці.

2. Напісаць заяву з просьбай даць субсідыю.

3. Магчыма, прайсці курсы прадпрымальніцкай дзейнасці.

4. Скласці бізнес-план.

5. Атрымаць адабрэнне ва ўпраўленні занятасці насельніцтва.

6. Заключыць дагавор і атрымаць субсідыю.

7. Зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка альбо зарэгістраваць прыватнае ўнітарнае прадпрыемства.

8. У далейшым — даць справаздачу аб тым, як былі выдаткаваны грошы.

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

АБ ПРАВАВЫМ РЭГУЛЯВАННІ ПАМЕРУ АПЛАТЫ ЧАСУ ВЫМУШАНАГА ПРАГУЛУ РАБОТНІКУ, АДНОЎЛЕНАМУ НА РАНЕЙШАЙ ПРАЦЫ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Карповіч Н.А., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

разгледзеў у адкрытым судовым пасяджэнні справу «Аб прававым рэгуляванні памеру аплаты часу вымушанага прагулу работніку, адноўленаму на ранейшай працы».

У судовым пасяджэнні прынялі ўдзел прадстаўнікі дзяржаўных органаў і іншых арганізацый:

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Забара А.А., намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Бодак А.М., намеснік міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Клімаў В.Д., начальнік упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь — Маслоўская В.В., начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь;

Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — Шэлковіч У.І., начальнік галоўнага прававога ўпраўлення апарата Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Справа заведзена Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь 20 чэрвеня 2014 г. у адпаведнасці з часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, часткамі першай і трэцяй артыкула 158 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб канстытуцыйным судаводстве» на падставе звароту адкрытага акцыянернага таварыства «Желдорсервис г. Могилев».

У звароце акцыянернага таварыства ўказваецца на супярэчлівую судовую практыку ў частцы заліку кампенсацыі за нявыкарыстаны працоўны водпуск пры вызначэнні памеру аплаты работніку часу вымушанага прагулу. Заяўнік спасылаецца на тое, што час аплачанага вымушанага прагулу ўключаецца ў рабочы год, за які прадастаўляецца працоўны водпуск, у сувязі з чым работнік, адноўлены на ранейшай працы, мае права патрабаваць прадастаўлення аплачваемага водпуску, які ўключае перыяд, за які яму пры звальненні ўжо выплачана грашовая кампенсацыя, чым уціскаюцца законныя інтарэсы наймальніка.

Заслухаўшы суддзю-дакладчыка Варановіча Т.В., выступленні прадстаўнікоў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі, Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і іншых актаў заканадаўства, вывучыўшы матэрыялы справы, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь устанавіў.

1. У адпаведнасці з часткай першай артыкула 42 Канстытуцыі асобам, якія працуюць па найме, гарантуецца справядлівая доля ўзнагароджання ў эканамічных выніках працы ў адпаведнасці з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем, але не ніжэй за ўзровень, які забяспечвае ім і іх сем'ям свабоднае і годнае існаванне.

Згодна з часткай першай артыкула 244 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК), у выпадках аднаўлення работніка на ранейшай працы, а таксама змянення фармулёўкі прычыны звальнення, якая перашкаджала паступленню работніка на новую працу, яму выплачваецца сярэдні заробак за час вымушанага прагулу.

У ПК прадугледжана, што ўмовы і парадак вылічэння сярэдняга заробку, які захоўваецца за час працоўнага і сацыяльнага водпускаў, выплаты грашовай кампенсацыі за нявыкарыстаны працоўны водпуск вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам (артыкул 81); сярэдні заробак вылічваецца для аплаты часу ў тым ліку вымушанага прагулу ў выпадках аднаўлення работніка на ранейшай працы (пункт 2 часткі першай артыкула 82).

Умовы і парадак вылічэння сярэдняга заробку вызначаны Інструкцыяй аб парадку вылічэння сярэдняга заробку, які захоўваецца ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, зацверджанай пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2000 г. № 47 «Об утверждении условий и порядка исчисления среднего заработка, сохраняемого за время трудового (основного и дополнительного) и социального (в связи с обучением) отпусков, выплаты денежной компенсации за неиспользованный трудовой отпуск и в других случаях, предусмотренных законодательством, а также перечня выплат, учитываемых при исчислении среднего заработка» (у рэдакцыі пастановы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 27 красавіка 2006 г. № 37) (далей — Інструкцыя аб парадку вылічэння сярэдняга заробку).

Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у пункце 51 пастановы ад 29 сакавіка 2001 г. № 2 «О некоторых вопросах применения судами законодательства о труде» растлумачыў, што ў матываваным рашэнні (матывіровачнай частцы рашэння) аб аднаўленні на працы павінна быць указана, за які час, з якога сярэдняга заробку і ў якім размеры вызначана аплата за вымушаны прагул; пры гэтым судам неабходна мець на ўвазе, што сярэдні заробак, у адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 82 ТК, вылічваецца, зыходзячы з заработной платы, налічанай работніку за два каляндарныя месяцы, што папярэднічаюць месяцу яго звальнення; умовы і парадак вылічэння сярэдняга заробку вызначаны пастановай Міністэрства працы ад 10 красавіка 2000 г. № 47; пры спагнанні на карысць работніка сярэдняга заробку падлягаюць заліку выплачаная выхадная дапамога і кампенсацыі, звязаныя са звальненнем; заработная плата, атрыманая за час працы ў іншага наймальніка пасля незаконнага звальнення; дапамога па часовай непрацаздольнасці, выплачаная істцу ў межах тэрміну аплачваемага вымушанага прагулу.

2. У адпаведнасці з артыкулам 39 Закона «Аб канстытуцыйным судаводстве» ў Вярхоўны Суд, Генеральную пракуратуру, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Канстытуцыйным Судом былі накіраваны запыты, у пісьмовых адказах на якія ўказаныя дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі выклалі сваё меркаванне па справе.

Вярхоўны Суд лічыць, што пытанне аб заліку выхадной дапамогі і іншых выплат пры вызначэнні судом размеру аплаты часу вымушанага прагулу можа быць урэгулявана нарматыўнымі прававымі актамі. У прыватнасці, такое рэгуляванне можа быць ажыццёўлена Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Генеральная пракуратура адзначае, што ў актах заканадаўства аб працы не рэгламентаваны парадак заліку грашовых сум, выплачаных работніку пры звальненні, у выпадку яго аднаўлення на працы. Гэтыя нормы змяшчаюцца толькі ў пастанове Пленума Вярхоўнага Суда ад 29 сакавіка 2001 г. № 2. З мэтай выключэння прававой нявызначанасці Генеральная пракуратура мяркуе неабходным ажыццявіць адпаведнае прававое рэгуляванне на ўзроўні пастановы Савета Міністраў.

Міністэрства юстыцыі лічыць, што розныя падыходы да прававога рэгулявання заліку выплат, атрыманых работнікам пры звальненні, пры вызначэнні размеру аплаты вымушанага прагулу ў выпадку аднаўлення яго на ранейшай працы, замацаваныя ў ПК, Інструкцыі аб парадку вылічэння сярэдняга заробку і пастанове Пленума Вярхоўнага Суда ад 29 сакавіка 2001 г. № 2, могуць прыводзіць да неадназначнага разумення адпаведных прававых нормаў, супярэчлівай правапрымяняльнай практыкі і, як вынік, парушэння правоў і інтарэсаў работніка і наймальніка. У сувязі з гэтым, па меркаванні Міністэрства юстыцыі, неабходна ўстараніць няўзгодненасць прававых нормаў актаў заканадаўства аб працы.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўказвае, што ў ТК і ў Інструкцыі аб парадку вылічэння сярэдняга заробку адсутнічаюць нормы, якія дазвалялі б рабіць залік выплачанай грашовай кампенсацыі за нявыкарыстаны працоўны водпуск і выхадной дапамогі ў разлік сумы сярэдняга заробку, які падлягае выплаце адноўленаму работніку за час вымушанага прагулу.

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі адзначае, што нарматыўнымі прававымі актамі парадак заліку якіх-небудзь кампенсацый і іншых выплат пры вызначэнні судом размеру аплаты часу вымушанага прагулу не вызначаны, таму гэтае пытанне трэба ўрэгуляваць на заканадаўчым узроўні.

Пазіцыя кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта заключаецца ў тым, што заканадаўца не прадугледзеў магчымасці заліку якіх-небудзь сум, выплачаных пры звальненні работніка, пры вызначэнні судом размеру аплаты часу вымушанага прагулу (частка першая артыкула 244 ТК). Растлумачэнне, якое змяшчаецца ў абзацы трэцім пункта 51 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда ад 29 сакавіка 2001 г. № 2, не адпавядае ПК і ў парушэнне часткі першай артыкула 23 Канстытуцыі абмяжоўвае правы работнікаў.

3. Згодна з Канстытуцыяй Рэспубліка Беларусь — дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава (частка першая артыкула 1).

Абвяшчаючы чалавека, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы, Канстытуцыя вызначае, што забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы, дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы, а таксама абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка першая артыкула 2, часткі першая і трэцяя артыкула 21, частка першая артыкула 59).

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на працу як найбольш дастойны спосаб самасцвярджэння чалавека, гэта значыць, права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцяў, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы (частка першая артыкула 41 Канстытуцыі).

Канстытуцыйны Суд адзначае, што, зыходзячы з указаных нормаў у іх узаемасувязі з часткай першай артыкула 60 Канстытуцыі, якая гарантуе кожнаму абарону яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны, а таксама палажэннямі міжнародна-прававых актаў, у тым ліку артыкула 8 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, пункта 1 артыкула 14 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, у выпадку парушэння працоўных правоў дзяржава абавязана забяспечыць работніку яго права на судовую абарону, якая павінна быць справядлівай, поўнай і эфектыўнай.

Згодна з часткай першай артыкула 112 Канстытуцыі, суды ажыццяўляюць правасуддзе на аснове Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю іншых нарматыўных актаў.

У ПК вызначана, што непасрэдна ў судзе разглядаюцца працоўныя спрэчкі па заявах работнікаў, у тым ліку аб аднаўленні на працы незалежна ад падстаў спынення працоўнага дагавора, аб аплаце за час вымушанага прагулу або выканання ніжэйаплатнай работы; у выпадку аднаўлення работніка на ранейшай працы яму выплачваецца сярэдні заробак за час вымушанага прагулу (пункт 3 часткі другой артыкула 241, частка першая артыкула 244).

Указанае заканадаўчае рэгуляванне падразумявае забеспячэнне судовай абароны працоўных правоў работніка, звольненага з працы без законнай падставы.

4. Зыходзячы са зместу часткі першай артыкула 42 Канстытуцыі і заснаванай на ёй нормы ПК (пункт 5 артыкула 11), якія замацоўваюць права работнікаў на гарантаваную справядлівую долю ўзнагароджання за працу ў адпаведнасці з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем, але не ніжэй за ўзровень, які забяспечвае работнікам і іх сем'ям свабоднае і годнае існаванне, у артыкуле 57 ТК вызначана, што заработная плата — узнагароджанне за працу, якое наймальнік абавязаны выплаціць работніку за выкананую працу ў залежнасці ад яе складанасці, колькасці, якасці, умоў працы і кваліфікацыі работніка з улікам фактычна адпрацаванага часу, а таксама за перыяды, якія ўключаюцца ў працоўны час.

Згодна з часткай першай артыкула 77 ПК, пры звальненні работніка ўсе выплаты, належныя яму ад наймальніка, праводзяцца ў дзень звальнення. Калі работнік у дзень звальнення не працаваў, то адпаведныя выплаты павінны быць праведзены не пазней за наступны дзень пасля прад'яўлення ім патрабавання аб разліку.

Да ліку выплат, якія праводзяцца пры звальненні работніка, адносяцца заработная плата, выхадная дапамога, кампенсацыі, іншыя выплаты, на якія работнік мае права ў адпаведнасці з заканадаўствам і (або) калектыўным дагаворам, пагадненнем.

Падставы спынення працоўнага дагавора, пры якіх павінна выплачвацца выхадная дапамога, і яе размеры вызначаны ПК. Замацаваны часткамі другой — пятай артыкула 48 ПК пералік падстаў выплаты выхадной дапамогі не з'яўляецца вычарпальным, паколькі ў адпаведнасці з ПК, іншымі заканадаўчымі актамі, калектыўным дагаворам, пагадненнем выхадная дапамога пры звальненні можа выплачвацца і ў іншых выпадках (частка першая ўказанага артыкула).

Са зместу часткі трэцяй артыкула 7 і часткі сёмай артыкула 48 ПК вынікае, што ў лакальным нарматыўным прававым акце (калектыўным дагаворы, пагадненні) могуць быць прадугледжаны іншыя выпадкі выплаты выхадной дапамогі і павялічаны яе размеры ў параўнанні з устаноўленымі ў ПК і іншых актах заканадаўства.

У разлік пры звальненні ўключаюцца і іншыя выплаты, на якія работнік мае права ў адпаведнасці з іншымі актамі заканадаўства, працоўным або калектыўным дагаворам, пагадненнем.

У прыватнасці, пунктам 2 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 1999 г. № 1180 «Об утверждении Примерной формы контракта нанимателя с работником» і падпунктам 10.9 пункта 10 Палажэння аб парадку і ўмовах заключэння кантрактаў наймальнікаў з работнікамі, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 верасня 1999 г. № 1476, прадугледжваецца выплата кампенсацыі за пагаршэнне прававога становішча работніка ў выпадку датэрміновага скасавання кантракта з-за невыканання або неналежнага выканання яго ўмоў па віне наймальніка, якая выплачваецца ў размеры не менш за тры сярэднямесячныя заработныя платы.

Такім чынам, заканадаўствам аб працы вызначаны выплаты, якія падлягаюць уліку (або не ўлічваюцца) пры вылічэнні сярэдняга заробку за час вымушанага прагулу. Пры гэтым заканадаўства аб працы ў частцы вызначэння размеру аплаты часу вымушанага прагулу работніку, які падлягае аднаўленню на ранейшай працы, не змяшчае палажэнняў аб заліку выплат, уключаных у разлік пры звальненні работніка, гэта значыць, аб магчымасці змяншэння вылічанага сярэдняга заробку за час вымушанага прагулу на пэўныя сумы.

5. Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на асобую прававую прыроду выхадной дапамогі ў параўнанні з іншымі выплатамі, якія выплачваюцца пры звальненні работніка.

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 1 лютага 2001 г. «О выходном пособии, выплачиваемом в соответствии с законодательством на основании коллективного договора при увольнении работника в связи с окончанием срока действия контракта» адзначалася, што мэта выхадной дапамогі заключаецца ў змякчэнні вынікаў, якія наступаюць са стратай асобай работы ў выпадку звальнення яе па ініцыятыве наймальніка за невінаватыя дзеянні па прычынах, якія не залежаць ад работніка, а таксама па акалічнасцях, якія не залежаць ад волі бакоў.

У адпаведнасці з падпунктам 5.10 пункта 5 пераліку выплат, якія ўлічваюцца пры падліку сярэдняга заробку, які з'яўляецца дадаткам да Інструкцыі аб парадку падліку сярэдняга заробку, прынятай у мэтах забеспячэння адзінага парадку вылічэння сярэдняга заробку, у тым ліку для аплаты часу вымушанага прагулу, выхадная дапамога (кампенсацыя), якая выплачваецца ў выпадку спынення працоўнага дагавора (кантракта), пры вылічэнні сярэдняга заробку не ўлічваецца.

Канстытуцыйны Суд мяркуе неабходным звярнуць увагу на рэгуляванне падобных грамадскіх адносін заканадаўствам іншых дзяржаў.

Так, часткай першай артыкула 178 Працоўнага кодэкса Расійскай Федэрацыі вызначана, што пры скасаванні працоўнага дагавора ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі або скарачэннем колькасці або штату работнікаў арганізацыі работніку, які звальняецца, выплачваецца выхадная дапамога ў памерах сярэдняга месячнага заробку, а таксама за ім захоўваецца сярэдні месячны заробак на перыяд працаўладкавання, але не больш за два месяцы з дня звальнення (з залікам выхадной дапамогі).

Грунтуючыся на гэтай норме Працоўнага кодэкса Расійскай Федэрацыі, Пленум Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі ў пастанове ад 17 сакавіка 2004 г. № 2 «О применении судами Российской Федерации Трудового кодекса Российской Федерации» растлумачыў, што пры спагнанні сярэдняга заробку на карысць работніка, адноўленага на ранейшай працы, або ў выпадку прызнання яго звальнення незаконным выплачваная яму выхадная дапамога падлягае заліку. Аднак пры вызначэнні памеру аплаты часу вымушанага прагулу сярэдні заробак, які спаганяецца на карысць работніка за гэты час, не падлягае змяншэнню на сумы заработнай платы, атрыманай у іншага працадаўцы, незалежна ад таго, працаваў у яго работнік на дзень звальнення ці не, дапамогі па часовай непрацаздольнасці, выплачаныя істцу ў межах тэрміну аплачваемага прагулу, а таксама дапамогі па беспрацоўі, якую ён атрымліваў у перыяд вымушанага прагулу, паколькі ўказаныя выплаты дзеючым заканадаўствам не аднесены да ліку выплат, якія падлягаюць заліку пры вызначэнні памеру аплаты часу вымушанага прагулу (абзац чацвёрты пункта 62).

У сувязі з выкладзеным Канстытуцыйны Суд адзначае магчымасць выкарыстання ўказанага падыходу ў частцы заліку выхадной дапамогі ў прававым рэгуляванні вызначэння памеру аплаты часу вымушанага прагулу работніку, адноўленаму на ранейшай працы, у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

6. Згодна з Канстытуцыяй у Рэспубліцы Беларусь, устанаўліваецца прынцып вяршэнства права; дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства (часткі першая і другая артыкула 7).

У Пасланні Канстытуцыйнага Суда «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2013 годзе» ўказана, што галоўнымі фактарамі зацвярджэння канстытуцыйнай законнасці ў заканадаўстве і правапрымяненні з'яўляюцца няўхільнае выкананне прынцыпу вяршэнства права, гарантаванае забеспячэнне правоў і свабод грамадзян, стварэнне і рэалізацыя такіх прававых механізмаў, якія эфектыўна дапамагалі б умацаванню канстытуцыйнай законнасці.

У рашэннях Канстытуцыйнага Суда неаднаразова адзначалася, што рэалізацыя ў нарматворчасці прынцыпу вяршэнства права і заснаванага на ім прынцыпу прававой пэўнасці падразумявае стварэнне прававой сістэмы, у якой нарматыўныя прававыя акты знаходзяцца ва ўзаемасувязі, узгоднены паміж сабой, а таксама забяспечваюць яснасць, дакладнасць, несупярэчлівасць і ўзгодненасць прававых нормаў.

Прынцып вяршэнства права азначае ў тым ліку паўнату і дакладнасць нормаў аб правах і абавязках грамадзян, адпаведнасць іх паміж сабой у розных нарматыўных прававых актах. Наяўнасць у заканадаўстве прабелаў, калізій прававых нормаў і прававой нявызначанасці ў заканадаўстве аб працы і правапрымяненні ў ПК неабходна ўрэгуляваць пытанне заліку выплат, атрыманых работнікам пры звальненні, у выпадку аднаўлення яго на ранейшай працы пры вызначэнні памеру аплаты часу вымушанага прагулу.

На падставе выкладзенага і кіруючыся часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22, артыкулам 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, часткай другой артыкула 74, артыкуламі 75, 77, 80, 84, часткай сямнаццатай артыкула 85, артыкулам 160 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб канстытуцыйным судаводстве», Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

ВЫРАШЫЎ:

1. У мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, для ўстаранення прававой нявызначанасці ў прававым рэгуляванні вызначэння памеру аплаты часу вымушанага прагулу работніку, адноўленаму на ранейшай рабоце, прызнаць неабходным унясенне ў Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь змяненняў у частцы ўрэгулявання пытання заліку выплат, атрыманых работнікам пры звальненні, пры вызначэнні памеру аплаты часу вымушанага прагулу.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць праект закона аб унясенні адпаведных змяненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь і ўнесці яго ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

2. Гэтае рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

3. Апублікаваць гэтае рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ

№ Р-945/2014

10 ліпеня 2014 г. г. Мінск

■ Блакітнавокая

ПАХНЕ ЧАБОР НА СВІЦЯЗІ

Возера Свіцязь — яшчэ адно з ліку тых, што прэтэндуюць на званне найпрыгажэйшых у Беларусі. Амаль ідэальна круглая форма, чыстая празрыстая вада, тоўшча лесу навокал — гэта стварае ўражанне пэўнай прыроднай кулуарнасці, адметнасці, закрытасці ад старонняга свету. Незвычайную атмасферу дапаўняюць легенды, паэмы, што апяваюць гэтае возера.

«Я ж вам казаў, што вы ўлюбіцеся ў наша возера!» — так у захапленні ўсклікнуў **Аляксандр КАЧАН, дырэктар ландшафтнага заказніка «Свіцязянскі».** І сапраўды, абыякавым гэтае возера цябе не пакіне. На яго хочацца нават проста глядзець, калі няма магчымасці разгарнуць мяккія хвалі. Быццам зашыфраванa ў ім нейкая таямніца, сакрэтны код. У паўсядзённым жыцці ты можаш глядзець навокал і нічога не заўважаць. Але, калі апынаешся ля Свіцязі, з'яўляецца адчуванне, што сама прырода падпусціла цябе да свайго сэрца. Проста глядзіш, назіраеш, убіраеш харaство, якое застанецца з табой надоўга.

Часта людзі, што жывуць ля мора, прыязджаюць да яго проста для таго, каб пасядзець побач, супакоіцца. Тое ж можна рабіць і ля Свіцязі: думкі, абляцеўшы возера, не сягаюць у далячынь, а вяртаюцца назад, падначальваюцца вышэйшаму парадку. А магутны лес — як вартаўнік лагоднай вады, які ахоўвае яе спакой...

Калісьці тут часта бываў паэт Адам Міцкевіч. Ды не адзін, а са сваёй каханай Марыляй Верашчакай. І хоць яны не звязалі ў далейшым свае лёсы, гэтае пачуццё (як і краявіды) надоўга засталося ў сэрцы паэта. Міцкевіч раіць усім, нават нам, вандроўнікам XXI стагоддзя:

Калі навагрудскія ўбачыш прасторы,
Ракітнік разгалісты, нізкі, —
Каня супыні ля плужынскага бору,
Каб глянуць на возера зблізку.
Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна люду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых.

Дзяўчынка ўсё-такі азірнулася

Гэта радкі з балады пад назвай «Свіцязь». Аднак напісаў паэт яшчэ і «Свіцязянку», прысвечаную дачцэ легендарнага князя Свіцязянскага. Дарэчы, гэтую дзяўчыну, толькі ў выглядзе меднай скульптуры, сёння можна ўбачыць проста ў возеры: яна выходзіць з вады. У легендзе, звязанай з ёй, расказваецца пра паходжанне вадаёма:

Рэдкая рэліктавая кветка пад назвай лабелія Дортмана можа расці ў вельмі чыстай вадзе.

На месцы возера калісьці стаяў горад. У той час літоўскім навагрaдскім князем быў Міндоўг. Адной-чы ён, адпраўляючыся на бітву, папрасіў дапамогі ў князя Свіцязянскага, з якім сябраваў. Той згадзіўся і выправіўся ў шлях разам з усімі мужчынамі. У горадзе ж засталіся толькі старыя, жанчыны і дзеці, сярод якіх князева дачка Свіцязянка. Ворагі дазналіся пра гэта, і вырашылі захапіць горад. Але да Свіцязянкі прыйшоў стары, які хацеў папярэдзіць і ўратаваць яе і ўсіх свіцязян, і параіў: «Ідзіце з гэтага горада, тольки не азірайцеся». Яны выправіліся ў шлях, але дзяўчына ўсё ж на хвіліну азірнулася — і ператварылася ў камень. Горад знік, а на яго месцы з'явілася возера... Іншая легенда расказвае, што падчас аблогі горада свіцязяне, каб не здавацца, самі звярнуліся да духоўных сіл, і тыя апусцілі іх зямлю пад ваду. Пасярэдзіне возера засталася толькі гарадская званіца. Хтосьці з купальшчыкаў казаў, што, на досвітку падплываючы туды, бачыў вежы гэтай званіцы. Жыхары ператварыліся ў цудоўныя цар-кветкі (пралескі), што ўвесну цвітуць на беразе.

Вада чыстая, як шкло

Аляксандр Качан адзначае, што па ўсім перыметры возера акружае вал. Ён упэўнены, што сам сабой той з'явіцца не мог. Пэўна, людзі спрычыніліся да гэтага, але з якой мэтай, невядома. Таксама і пешаходная дарожка побач быццам была насыпана нейчымі рукамі...

Возера ледавіковага паходжання, таму вада ў ім хутка самаачышчаецца. Растуць тут рэдкія рэліктавыя кветкі пад назвай лабелія Дортмана (акрамя гэтага месца, знойдзены толькі ў Белым возеры пад Лунінцам). Яны, дарэчы, могуць расці толькі ў вельмі чыстай вадзе.

Летам адпачыць сюды адначасова можа прыехаць каля шасці тысяч чалавек. Часта не тое што прылегчы няма дзе, але і прайсці. Аднак вада, узбаламучаная купальшчыкамі, раніцай зноў чыстая і празрыстая. Нават ідучы па моcце, што вядзе да альтанкі, можна бачыць маленькія каменьчыкі, якія ляжаць на самым дне.

Летам у разгар купальнага сезона на бераг выходзіць шмат свіцязянак.

Каля дарогі маюцца аўтастаянкі — некаторыя з іх платныя, а некаторыя бясплатныя, у тым ліку для экскурсійных аўтобусаў. Тым, хто хоча затрымацца на некалькі дзён у сваім намёце, можна спыніцца на спецыяльна адведзенай для гэтага пляцоўцы.

Калі ехаць сюды з беларускай сталіцы на аўтобусе Мінск — Свіцязь, то, добра адпачыўшы, вярнуцца дадому ў гэты ж дзень не атрымаецца: аўтобус выходзіць ужо ў 14.00, больш позніх рэйсаў няма. Аднак даволі часта аўтобусы ходзяць у суседнія Навагрудак і Баранавічы — там знайсці сабе жыллё і пераначаваць праблемай не будзе. Да таго ж з'явіцца нагода паглядзець гэтыя гарады.

Сядзіба 12 месяцаў

Сёлета ля возера Свіцязь з'явілася выдатная турыстычна-адукацыйная навінка, праўда, для дзяцей. Тут пачала працаваць Сядзіба 12 месяцаў. На кожны месяц распрацавана асобная праграма, адпаведная таму, што адбываецца ў прыродзе, а таксама беларускім традыцыям гэтага часу. Дзеці гуляюць, удзельнічаюць у конкурсах, выконваць розныя заданні для агульнага развіцця. Усё суправаджаецца падарункамі, прызамі, піццём гарбаты, настоенай на зёлках.

У цёплы час тут пастаянна працуе экалагічная сцежка з разнастайнымі прыпынкамі, напрыклад, Палянай павука і Горадам майстроў. У апошнім, дарэчы, дзеці маюць магчымасць паўдзельнічаць у майстар-класе і самім зрабіць саламяны сувенірны пантофлік.

Падаецца, на гэтым маршруце было б цікава пабываць кожнаму беларускаму дзіцяці — асабліва тым, якія растуць у гарадах — дакрануцца да прыроды, пакаштаваць яе на смак і адчуць водар... Такім чынам, на Сядзібе 12 месяцаў можна адпачыць пару гадзін, пакінуўшы аўтобус на стаянцы, а пасля адправіцца ў далейшую вандроўку.

Калі русалкі спяць...

Аляксандр Качан расказаў, што любіць плаваць у Свіцязі ў самым пачатку дня, і на тое ў яго ёсць асабістыя прычыны:

— Летам, у разгар купальнага сезона, на бераг выходзіць шмат свіцязянак. Асабліва як крыху пачынае цямнець... Яны крочаць у «экзатычным выглядзе» і, мякка кажучы, нікога не саромеюцца, адчуваюць сябе вельмі спакойна і ўпэўнена. Таму я люблю купацца з самай раніцы, гадзін у шэсць, калі ўсе русалкі спяць. У такі час возера ахутана дымкай, вада цёплая, быццам сыradой. А навокал цішыня...

Варта яшчэ раз прыгадаць густы хваёва-лісцёвы лес, што шчыльным колам акружае возера, і той самы чабор, апеты Адамам Міцкевічам, водарам якога дагэтуль насычана паветра. Возера Свіцязь сапраўды вартае таго, каб яго ўбачыў кожны беларус. Аднак, прыехаўшы сюды ў летнюю спёку, не здзіўляйцеся, калі ўбачыце тут адразу ўсё насельніцтва Навагрудка і Баранавіч.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Навагрудскі раён

■ Горад-спадчына

ЗАХАВАЦЬ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

ГРОДНА ІМКНЕЦЦА НАБЫЦЬ СТАТУС ГОРАДА-ПОМНІКА

Кафедральны сабор у гонар святога Францішка Ксаверыя.

Сёлета культурная сталіца Беларусі — Гродна, унікальны па сваёй архітэктуры і гісторыі горад. Яго называюць каралеўскім, бо тут ёсць цэлыя два каралеўскія замкі, бо менавіта гэты горад пры Вітаўце Вялікім, Стэфане Баторыі і Аўгусце Панятоўскім станавіўся цэнтрам палітычнага і культурнага жыцця спачатку Вялікага Княства Літоўскага, а пазней — Рэчы Паспалітай. А яшчэ ён — сапраўдная энцыклапедыя архітэктурных стыляў. Сёння Гродна спадзяецца на наданне яго гістарычнай часткі статусу горада-помніка, гэта дапаможа вырашыць пэўныя праблемы і з рэстаўрацыяй, і з доглядам старых будынкаў, а яшчэ палепшыць мясцовы турыстычны клімат.

Дэпутат Алена БЕРАСНЕВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, сваю дэпутацкую дзейнасць у многім прысвяціла аднаўленню гісторыка-культурнай спадчыны роднага горада. У размове з карэспандэнтам «Звязды» парламентарый расказала пра ролю ў гэтым мясцовых улад і жыхароў, пра важнасць працы журналістаў і навукоўцаў, а таксама аб праблемах, з якімі сутыкнулася грамадскасць, калі сабрала сродкі на рэстаўрацыю Каложскай царквы.

ПРАЦЯГНУЦЬ ПАЧЫНАННЕ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

— Усе разумеюць, што гісторыю трэба захоўваць, што трэба развіваць турызм. Але для гэтага неабходна воля мясцовых улад, бо патрэбны вельмі вялікія грошы. Напрыклад, Стары горад у Гродне мае неабходнасць у рэстаўрацыі: ён пражыў не толькі войны, але і пажар 1885 года. Дарэчы, пасля яго Эліза Ажэшка, жыццё якой прайшло ў Гродне, арганізавала збор сродкаў на рэканструкцыю Старога горада. Будынкі аднаўляліся, але ў тых умовах для рамонту выкарыстоўвалі падгарэлыя бэлькі, якія, безумоўна, былі не вельмі добрым матэрыялам для гэтага, — распавядае Алена Бераснева.

З таго часу прайшло шмат гадоў, асобныя будынкі рэстаўраваліся, але рамонту ўсіх старых кварталаў у цэлым пакуль не было.

— Прыходзілі да ўсведамлення таго, што гэта неабходна, яшчэ ў савецкія гады. У канцы 80-х звярталіся ў маскоўскія структурныя інстанцыі з прапановай прызнаць гістарычны цэнтр Гродна горадам-помнікам. І калі б гэта рашэнне было прынятае, то, натуральна, было б выдаткавана фінансаванне, быў бы больш высокі статус у самога горада. Але Савецкі Саюз развaліўся, і ідэя пацярпела крах, — кажа дэпутат.

У двухтысячных мясцовыя ўлады зноў прыйшлі да ўсведамлення таго, як важна зберагчы гістарычны выгляд Гродна. Была распрацавана праграма «Спадчына», дзе распісана, як павінна выглядаць гістарычная частка горада. Стары горад павінен стаць музейна-офісным, пераважна нежылым, з пешаходнымі вуліцамі. Праектавалася нават аб'язное кола вакол гістарычнага цэнтра, каб можна было праз яго праехаць у іншую частку горада, не заязджаючы ў старыя кварталы. На жаль, інвестараў не знайшлі. Тым не менш пра ідэю аднаўлення горада не забыліся. Некалькі гадоў таму ўсё ж такі была пабудавана дарога, па якой можна пераехаць з аднаго мікрараёна ў другі, абмінаючы гістарычны цэнтр.

Пазней была прынята яшчэ адна праграма — па рэгенерацыі і захаванні гістарычнай спадчыны. Для яе рэалізацыі гарвыканкам звярнуўся з просьбай у адзін з беларускіх банкаў аб выдзяленні шматмільённага доларавага крэдыту. Праграма мае на мэце рэканструкцыю будынкаў старога квартала Гродна, стварэнне неабходнай для турыстаў інфраструктуры ў прыватнасці і развіццё турызму як важнага складніка эканомікі рэгіёна ў цэлым.

Мясцовыя ўлады часта не вельмі хочуць, каб аб'ект набываў нейкі статус. Неабходна будзе атрымліваць спецыяльны дазвол на самыя звычайныя работы ў будынку, які стаў гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

— Хацелася б сказаць, што мясцовыя ўлады часта не вельмі хочуць, каб пэўны аб'ект набываў нейкі статус, — заўважае парламентарый. — Іх можна зразумець: пасля неабходна будзе атрымліваць спецыяльны дазвол на самыя, здавалася б, звычайныя работы ў будынку, які стаў гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Такім чынам ускладняецца выкарыстанне гэтых аб'ектаў у гаспадарцы. Але якраз у Гродне ініцыятыва прыйшла і ад жыхароў горада, і ад мясцовых улад амаль адначасова.

ПРЫКЛАД З ПРАФЕСІЙНАЙ ПРАКТЫКІ

Дэпутат упэўнена, што мы, маючы такую багатую гістарычную спадчыну, маглі б на гэтым зарабляць. Беларусь зусім іншая краіна, з цікавай гісторыяй і культурай. І трэба зрабіць так, каб пра гэта даведаліся ва ўсім свеце, каб наша спадчына не знікла з-за таго, што мы не паспелі паклапаціцца пра яе. Алена Бераснева прывяла ў прыклад гісторыю са сваёй прафесійнай практыкі.

У самым пачатку цяперашняга стагоддзя Аўгустоўскі канал быў амаль невядомы шырокай аўдыторыі. Ён размяшчаецца ў пагранічнай зоне, і гадоў пятнаццаць таму звычайнаму чалавеку без спецыяльнага дазволу паехаць туды нельга было. Але так атрымалася, што якраз у той час Гродзенскі пагранічны атрад пачаў добра працаваць з вучонымі і дапусціў іх на ахоўную тэрыторыю.

— Хоць польская частка канала заўсёды эксплуатавалася, наша была ў заняпадзе. І вось я напісала матэрыял у газету «Рэспубліка», артыкул змясцілі на сайце, і... з Масквы прыехаў інвестар, які захацеў аднавіць канал. Але адмовіўся ад ідэі — грошай патрабавалася вельмі шмат. Інфармацыя, дзякуючы вучоным Гродзенскага ўніверсітэта, журналістам, пайшла ў народ.

Каналам зацікавіліся мясцовыя ўлады, і яны знайшлі паразуменне ў Анатоля Тозіка, які тады ўзначальваў Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь. Пагранічнікі, у сваю чаргу, таксама дапаможуць: яны распрацавалі спецыяльную сістэму аховы турыстычнага аб'екта, што знаходзіцца ў іх зоне адказнасці. На мяжы быў абсталяваны часовы пункт пропуску, турыстам дазволілі наведваць канал, хоць за яго межы выходзіць нельга.

КАЛОЖЫ НЕАБХОДНА ДАПАМОГА ЮНЕСКА

Сёння Аўгустоўскі канал прэтэндуе на занясенне ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ад нашай краіны. Праўда, калі яго туды ўключаць, пакуль што невядома. Як правіла, само ўключэнне ў гэты спіс не дае асаблівых грошай аб'екту, затое гэта вельмі прэстыжна для краіны. Ды і, як паказвае практыка, з атрыманнем такога статусу прыток турыстаў узрастае як мінімум на 30%.

Яшчэ адзін аб'ект, які таксама прэтэндуе на ўключэнне ў спіс помнікаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, — Каложская царква ў Гродне. Дарэчы, яна сярод прэтэндэнтаў ад Беларусі займае першае месца. Для таго, каб яе ўключылі ў спіс, неабходна не проста дачакацца моманту, калі камісія захоча наведаць аб'ект. Царкве патрабуецца сур'ёзная рэстаўрацыя.

— Каложская царква — сапраўды незвычайны аб'ект, — расказвае мая суразмоўца. — Яна была пабудавана ў XII стагоддзі па ўнікальнай тэхналогіі. Бяда Каложы ў тым, што яна стаіць на самым беразе Нёмана, які вада на працягу стагоддзяў падмывала. Бераг стаў абсыпацца, і палова царквы абвалілася. Дабудавалі драўляную частку — такой яна і дайшла да нашых дзён.

У 90-я гады мясцовыя ўлады ўмацавалі бераг, а ў 2010 годзе ўзнікла прапанова адрамантаваць царкву на народныя грошы. Вельмі многія адгукнуліся, і неабходная сума была сабрана. Але пасля зразумелі, што, каб вынік працы рэстаўратараў адпавядаў патрабаванням ЮНЕСКА, каб царква адпавядала патрабаванням аўтэнтычнасці, неабходны дакладныя звесткі. Стала ясна: Каложа пасля рэстаўрацыі будзе захавана як культавы аб'ект, але малаверагодна, што яна атрымае статус аб'екта сусветнай спадчыны. Таму ад ідэі тады адмовіліся. А сабраныя грошы аддалі на будаўніцтва архіерэйскага падворка.

— Менавіта тут і хацелася б ад экспертаў ЮНЕСКА атрымаць дапамогу — парады наконт рэстаўрацыі будынка. Вопыт такой працы з прадстаўнікамі гэтай арганізацыі ў нашай краіны ўжо ёсць: менавіта так праходзіла рэстаўрацыя Мірскага замка, які сёння з'яўляецца аб'ектам сусветнай спадчыны.

У ГІСТАРЫЧНЫМ ЦЭНТРЫ ГІСТОРЫЮ МАЕ ЎСЁ

— Калі гістарычны цэнтр Гродна атрымае статус горада-помніка, мясцовыя ўлады возьмуць на сябе абавязак захаваць яго ў аўтэнтычным выглядзе. Ён павінен будзе стаць адзінай ландшафтнай тэрыторыяй і займець буферную зону. У старых кварталах будзе мінімум жылых дамоў, у асноўным — музеі, офісы, аб'екты турыстычнай інфраструктуры, — кажа Алена Бераснева.

Само ўключэнне ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА не дае асаблівых грошай аб'екту. Затое гэта вельмі прэстыжна для краіны. Ды і з атрыманнем такога статусу прыток турыстаў узрастае як мінімум на 30%.

Але гэта патрабуе сапраўды тытанічных намаганняў. Як расказала мне суразмоўца, у цэнтральнай частцы Гродна нават водаправод у нейкім сэнсе гістарычны — яму больш за 100 гадоў.

— А ўяўляеце, што такое адрамантаваць такі стары водаправод? Якія намаганні, грошы для гэтага патрэбны? — задаецца пытаннем парламентарый.

Яшчэ адна праблема — у Старым горадзе шмат жылых дамоў. Так павялося яшчэ пасля Вялікай Айчыннай вайны: тых, хто прыехаў у Гродна — ваенных, будаўнікоў, якім не было дзе жыць, сялілі ў пустыя дамы. Апошнія раней належалі палякам, якія пасля таго, як Гродна ўвайшоў у склад БССР, пераехалі ў Польшчу, або яўрэям, якія ў большасці сваёй былі вынішчаны фашыстамі. Сёння амаль усе такія дамы — культурныя помнікі.

З наданнем Гродна статусу горада-помніка ў мясцовых улад будзе больш выразная адказнасць за гэтыя дамы, і яны змогуць адрамантаваць іх, а калі неабходна — правесці рэстаўрацыю.

Сёння ж, пакуль такога статусу Гродна яшчэ не атрымаў, ужо вырашана, што з тых дамоў, якія прызнаны «лядашчым жытлом», людзі пры жаданні могуць пераехаць у новыя дамы. Такая праграма ўжо працуе. Старыя ж дамы будуць рамантавацца, а потым іх здадуць арганізацыям пад офісы, крамы, музеі — тады будынкі будзе лягчэй падтрымліваць у добрым стане.

БАГАЦЦЕ ГРОДНА

Сёння тэрыторыя гістарычнага цэнтра займае больш за 300 гектараў, на якіх размешчана 389 аб'ектаў, з іх больш за 350 — будынкі. Сярод іх, акрамя вышэйназваных Каложскай царквы, трэба назваць два каралеўскія замкі — Стары і Новы. Дарэчы, Стары замак сёння ўключаны ў дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі», разлічаную да 2018 года. Існуе праект яго аднаўлення па ўзоры XIV стагоддзя — часоў караля Стэфана Баторыя.

Горад ганарыцца кафедральным касцёлам Францішка Ксаверыя — шэдэўрам беларускага барока, які наведвалі рускі цар Пётр I, польскі кароль Аўгуст II. На вежы гэтага касцёла знаходзіцца самы старажытны вежавы гадзіннік у Беларусі (некаторыя навукоўцы сцвярджаюць, што гадзіннік самы стары сярод падобных ва ўсёй Еўропе). У касцёльны комплекс уваходзіць найстаражытнейшая ў Беларусі аптэка, у будынку якой сёння знаходзіцца музей-аптэка.

У Гродне можна паглядзець брыгіцкі манастыр з драўляным лямусам XVII стагоддзя (лямус — двухпавярховы драўляны будынак з арачнай галерэяй у два паверхі) — такіх практычна не захавалася на Беларусі.

У гэтым горадзе ёсць архітэктурны ансамбль «Гарадніца» XVIII стагоддзя са славутым тэатрам Тызенгаўза, сцэна якога — самая старажытная ў краіне. Тут жа знаходзяцца ажно тры рэзідэнцыі апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, а таксама палацы шляхты, цэрквы, касцёлы, манастыры, сінагога, кірха, помнікі прамысловай архітэктуры, мноства іншых будынкаў розных гістарычных эпох.

❍ ❍ ❍

Вельмі хочацца спадзявацца, што рашэнне праблем і з рэстаўрацыяй, і з наданнем асаблівых статусаў некаторым аб'ектам на Гродзеншчыне, залежыць толькі ад часу.

Надзея ЮШКЕВІЧ

РАСПЫТВАЮЧЫ СТАРАЖЫЛАЎ...

Гісторыя... Колькі загадкавага тоіцца ў гэтым слове. Колькі яшчэ не расказана, не высветлена. О, каб камяні маглі гаварыць!.. Часам гісторыя ляжыць на паверхні, а мы яе не заўважаем.

Бясспрэчна, не кожны цікавіцца гісторыяй свайго краю, маўляў, хапае сямейных турбот. Бывала, задаешся пытаннем: што мы распавядзём сваім нашчадкам, калі яны зацікавяцца мінуўшчынай? Каб мець адказ, трэба спяшацца распытаць у старажылаў свайго краю, сваіх мясцін, у якіх мы жывём, пра тыя таямніцы, якія часам з'яўляюцца найкаштоўнейшым скарбам у лёсе беларусаў. Менавіта старыя з'яўляюцца носьбітамі краязнаўчай інфармацыі.

Мая вёска Крупава ўмоўна падзелена на старую, цэнтральную і новую часткі. Як узгадваюць старажылы-крупаўчане, калісьці ўсе жылі на невялікім участку, зусім мала было двароў, але з цягам часу вёска пачала пашырацца, маладзейшыя пачалі будавацца — аддзяляцца ад сваіх бацькоў, а ўжо ў наш час, дзякуючы новабудоўлям, вёсцы быў нададзены статус аграгарадка.

Карэнных жыхароў, на жаль, з кожным годам становіцца менш і менш. Некаторыя пераязджаюць у горад да дзяцей і толькі час ад часу наведваюць сваё спрадвечнае месца жыхарства. Вітольд Карлавіч і Тарэза Браніслаўна Паўлюкевічы ўжо шэсць гадоў жывуць у Лідзе. Сын Вітольд і дачка Ірына таксама жывуць у горадзе. А бацькоўскую хату ў Крупаве даглядае сын Валерый, у якой і сам жыве. Калі-нікалі Вітольд Карлавіч наведваецца сюды — цягнуць яго родныя мясціны. Мілы той куток, дзе перарэзалі пупок! Упусціць шанц пагутарыць са старажылам я не мог.

— У сям'і майго дзеда Андрэя (па бацькавай лініі) было 6 дзяцей — 5 сыноў і адна дачка: Казік, Владак, Кароль, Міхась, Пятрук і Стася. Дачка памерла рана, ад туберкулёзу, нават і замуж не паспела выйсці, — прызнаецца мне Вітольд Карлавіч. — А вось дзядзькі Казік і Міхась былі адукаванымі. Казік нават вучыўся ў духоўнай семінарыі, хацеў стаць ксяндзом. Але ж так склаўся лёс, што калі заканчваў вучобу, яго ўгледзела адна дзяўчына. Заказаліся і згулялі вяселле. Прыйшлося хлопцу кідаць «ксяндзоўства», бо святарам-каталікам забаронена мець сям'ю... А вось другі сын, Міхась, малодшы за майго бацьку, працаваў у горадзе памочнікам у дзеда на дэпо. Дзяжурыў дзядзька на гэтай працы рознай парой, праўда, не ведаю якую меў пасаду, але не раз бачыў яго з карабінам, у форме... Помню, як прыйшоў ваенны час, так званыя «лапанкі», калі хапалі людзей на фронт. І ў рукі «хапуноў» трапіў сын Владака — Вацлаў. Агледзеўся дзядзька, што забіраюць братавага сына на фронт, з якога можа і не вярнуцца жывым. Тады неяк хітра ўзброены з карабінам дзядзька Міхась адвёў яго ў раён Астроўлі, быццам узяўшы пад арышт, і адпусціў: так дапамог яму выжыць. Нядаўна толькі памёр. А цяпер, што вельмі прыемна, унук Вацлава, Павел, закончыў Гродзенскую духоўную семінарыю і шчыруе ксяндзом у Ашмянскім касцёле. Ажыццявіў мару дваюраднага дзеда Казіка.

Праз некалькі хвілін спадар Вітольд Паўлюкевіч прамовіў:

— А якія святары былі! Не адмаўлялі ў просьбе людзям.

І ў памяці Вітольда Карлавіча ўсплыло, як яго, маладога на той час, папрасілі стаць кумам — хрышчоным бацькам. Быў перадсвяточны настрой перад Вялікаднем. Маладога хрышчонага папрасілі прывезці з горада, з фарнага касцёла, ксяндза Роека для правядзення хрышчэння ў крупаўскім касцёле. Прывезлі яго на хуткіх конях, якія добра слухаліся возніка: хапала крышку тузануць за лейцы, і яны чулі каманду. Святару Роеку здалося, што коні занадта дзёрзкія, аж забілі капытамі па мёрзлай зямлі, так рваліся ў дарогу. Ксёндз толькі папрасіў: «З месца шпарка не пускай». Але дарога, якая пралягала з Ліды да Крупава, не стаміла ксяндза, паездка спадабалася, пасля яе прамовіў: «Добра кіруеш. Нават лейцамі не заўважыў, як вырушыў».

— Нядрэнны быў ксёндз, хоць па нацыянальнасці быў немцам. Той час быў напружаны: святароў саджалі ў турмы, а вось ён змог прытрымацца на волі. Ён і пахаваны ля фарнага касцёла.

— Найважнейшай каштоўнасцю вёскі Крупава з'яўляецца наш касцёл, пабудаваны ў 1924 годзе. Можа, узгадаеце што-небудзь з гісторыі мясцовай святыні?

— Ужо сем гадоў да майго нараджэння ў касцёле праходзілі набажэнствы. Вядома, прымаць удзел у яго пабудове не прыйшлося. А мая маці, Адэля Адамаўна, калісьці ўзгадвала, што ўдзельнічала на будаўніцтве. Ёй, беднай, давялося працаваць за хворага мужа, за свайго брата. Былі адзначаны спецыяльныя дні для абавязковага ўдзелу на пабудове храма. Гэтыя дні нагадвалі шараварку — бясплатную абавязковую 6-дзённую працу на дарогах. Маці, дзякуй Богу, на свае гады была моцнай, вышыні не баялася, казала, што па драбінах хадзіла спакойна, адважна і насіла цэглу. Так што тут закладзена і часцінка працы маёй маці.

— А што ведаеце пра ксяндза Гудэйку? — узнікла ў мяне пытанне.

— Нашаму ксяндзу прыйшлося незаслужана адбываць зняволенне ў лагерах Сібіры. Дарэчы, ён таксама пахаваны на крупаўскіх могілках. Толькі нядаўна стала вядома, што сядзеў у турме ён «дзякуючы» арганісту. Да яго звярнуліся партызаны з мэтай паспавядацца, каб памерці з чыстай душой, бо адчувалі, што могуць не вярнуцца з задання. Гудэйка ім не адмовіў: гэта яго абавязак спавядаць. А арганіст гэта «пранюхаў» і далажыў «на верх». Хутка наехалі вялікія начальнікі, на рукі святару наклалі кайданкі, зрабілі яго бандытам. Людзі сабраліся, плакалі, не адпускалі ксяндза... За сем гадоў зняволення яго дапытвалі, хацелі дазнацца, што казалі партызаны яму падчас споведзі, але ён так і не прызнаўся: грэх раскрываць тайну споведзі. Як толькі Гудэйка вярнуўся са зняволення, арганіст адразу, як маланкай, выехаў у Літву... Вельмі хворым і змучаным вярнуўся ксёндз, але яшчэ некалькі гадоў у школе чытаў мудрыя лекцыі з хрысціянскага жыцця.

— Ці памятаеце ваенныя часы? Ці праходзілі немцы праз Крупава?

— Безумоўна! Тут, каля лазні і касцёла, была франтавая дарога, якая называлася Мытнянскім гасцінцам, па ёй суткамі праходзіў абоз. Помню, як праз яго зайшлі немцы і размясціліся ў Абрубах. Цэлы палігон быў: зброя і розная ваенная тэхніка. Дзесьці двое суткі немцы пражывалі там, нават і быка зарэзалі на тым месцы. Бяды не нарабілі, людзей не рушылі ды і наогул пасля сябе пакінулі толькі парадак. Калі што і трэба было ім, то без дазволу гаспадара не чапалі і не бралі. Калі паехалі, доўгі час заставаўся на гэтым месцы пах ад адэкалонаў: глядзелі сябе, адным словам, культурныя былі... Пасля праз некаторы час і «саветы» размясціліся на гэтым жа месцы, але, што цікава, пасля іх засталося толькі смецце... Той час быў гаротны. У Абрубы з'язджалася гарадское насельніцтва, з Ліды. У адной нашай хаце, у сям'і майго бацькі Караля было 6 сем'яў: свакоў і чужых. Дзяліліся ўсім, што было. Вядома ж, у бядзе не пакінеш. Цяперашняе жыццё лепшае. Але не кожнаму дагодзіш — так было і будзе. Усё ж, хто працуе, той мае хлеб і да хлеба. Жыць можна, хапае цяпер усяго. Трэба імкнуцца. Праца славіць чалавека.

Развітаўшыся хутка з суразмоўцам, я злавіў сябе на думцы: як бы не біла нас жыццё, але заставацца чалавекам трэба. Для мяне, прадстаўніка з маладога пакалення, такім прыкладам з'яўляецца сям'я Паўлюкевічаў.

Алесь ХІТРУН.

У Мсціславе перапахаваюць сярэднявечнага рыцара

Ёсць прынамсі дзве прычыны наведаць старадаўні горад на тэрыторыі Магілёўшчыны падчас сярэднявечнага фэсту, які адбудзецца ў бліжэйшыя выхадныя. Двухдзённая праграма абяцае шмат розных адкрыццяў і забаў. Але найбольш цікавымі стануць выстаўка рэдкіх археалагічных прадметаў, знойдзеных на мінулым тыдні, і перапахаванне сярэднявечнага воіна.

Сярод артэфактаў, якія можна будзе пабачыць на свае вочы, берасцяная грамата XII стагоддзя (трэцяя па ліку са знойдзеных на Беларусі!), каштоўныя ўпрыгожанні, элементы старажытнай зброі, візантыйская чаша для віна, распісаная золатам, і шмат чаго іншага. Гісторыкі мяркуюць, што ім пашчасціла знайсці княжацкі двор разам з ювелірнай майстэрняй. Што датычыцца перапахавання рыцара, то гэта і наогул незвычайны для нашай краіны факт. Па словах кіраўніка археалагічнай экспедыцыі, доктара гістарычных навук, прафесара Ігара Марзалюка, такое на тэрыторыі Беларусі адбудзецца ўпершыню. Сярэднявечныя рыцарскія даспехі, у якіх аказаліся астанкі воіна, былі знойдзены летась у мясцовай рачулцы Віхра.

— Ёсць звесткі, што 4 (16-га па новым стылі) лістапада 1502 года ў гэтым месцы адбылася бітва войскаў Вялікага Княства Маскоўскага і Вялікага Княства Літоўскага, — кажа Ігар Марзалюк. — Але арміі ВКЛ на чале з князем Міхаілам Заслаўскім не пашчасціла, яна была разбіта, а частка войска адступіла да замка, дзе зачынілася. Знойдзены намі рыцар якраз з тых, хто не паспеў выратавацца.

Перапахаванне адбудзецца перад пачаткам фестывалю. Па праваслаўнай традыцыі невядомага воіна адпяюць у кафедральным саборы ў гонар Аляксандра Неўскага, урна з яго прахам будзе пахавана ля падножжа Замкавай гары. Там ужо ўсталявана стэла ў выглядзе аркі ў гонар воінаў — абаронцаў Мсціслава. На магіле з'явіцца помнік з надпісам аб тым, што тут пахаваны невядомы рыцар, які загінуў падчас бітвы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Белинвестбанк

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

Наименование банка: ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		936 022	877 707
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		5 087	5 588
4	Средства в Национальном банке	1103		2 287 799	1 840 302
5	Средства в банках	1104		2 318 051	1 029 069
6	Ценные бумаги	1105		2 590 878	1 692 815
7	Кредиты клиентам	1106		17 296 786	13 392 729
8	Производные финансовые активы	1107		668 615	699 597
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		34 661	34 261
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		1 459 633	1 252 336
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		2 285	4 602
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		170 310	176 500
14	**ИТОГО активы**	**11**		**27 770 127**	**21 005 506**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		492 596	377 187
17	Средства банков	1202		4 422 898	2 206 154
18	Средства клиентов	1203		18 479 402	14 496 370
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		942 983	1 443 291
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		292 432	271 066
23	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**24 630 311**	**18 794 068**
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		1 167 408	567 408
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		123 461	90 278
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		1 037 986	920 910
29	Накопленная прибыль	1215		810 961	632 842
30	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**		**3 139 816**	**2 211 438**
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**27 770 127**	**21 005 506**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 года

Наименование банка: ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 712 878	1 326 147
2	Процентные расходы	2012		1 280 512	951 437
3	Чистые процентные доходы	201		432 366	374 710
4	Комиссионные доходы	2021		364 138	291 206
5	Комиссионные расходы	2022		69 620	55 161
6	Чистые комиссионные доходы	202		294 518	236 045
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		141	514
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		13 895	1 430
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		30 024	64 072
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		55 745	(4 485)
11	Чистые отчисления в резервы	207		83 014	40 123
12	Прочие доходы	208		73 051	53 122
13	Операционные расходы	209		600 349	429 327
14	Прочие расходы	210		57 974	66 401
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		158 403	189 557
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		15 776	18 384
17	**Прибыль (убыток)**	**2**		**142 627**	**171 173**

Председатель Правления **А.А. Лысюк**

Главный бухгалтер **А.Н. Сырокваш**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3, выдана Национальным банком Республики Беларусь 3 июня 2013 г. УНП 807000028

146

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29.
www.belinvestbank.by

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
►**ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Амкодор-Белвар» на праве собственности

Лот № 1	г. Минск, ул. Гикало, д. 1, пом. 13	Площадь, м²	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Задаток с НДС, бел. руб.	Шаг аукциона, %
		45,2	931 200 000	46 560 000	5

ОПИСАНИЕ

Помещение здравоохранения (Литер А 3/К), инв. № 500/D-723806. Назначение – помещение здравоохранения. Год постройки – 1949. Этаж – 2. Стены, перегородки – кирпичные, деревянные. Перекрытия – деревянные. Полы – паркет, линолеум, плитка. Проемы оконные – двойные. Проемы дверные – щитовые. Внутренняя отделка – есть. Отопление – стальные трубы. Водопровод – стальные трубы от уличной сети. Электроснабжение – скрытая проводка. Канализация – чугунные трубы, центральная. Вентиляция – приточно-вытяжная.

Лот № 2	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Задаток с НДС, бел. руб.	Шаг аукциона, %
	22 500 000 000	225 000 000	5

СОСТАВ ЛОТА № 2

